Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

19 ЖНІЎНЯ 2017 г. СУБОТА №159 (28523)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Кінолаг Каця і аўчарка Джэсі**
СТАР. 4



**На жніве — жанчыны і студэнты**
СТАР. 7



**Пясочныя карціны «жывуць» на фота**
СТАР. 9

# Эксперыменты на палях і незвычайны флэшмоб

## Аляксандр Лукашэнка пабываў на Прэзідэнцкім полі





Фота БЕЛТА.

**Кіраўнік дзяржавы апошнія тыдні шмат увагі ўдзяляе ўборачнай кампаніі. Асабіста выязджае ў рэгіёны і назірае за ходам уборачнай як зверху — з верталёта, так і непасрэдна з палёў... Але ў Прэзідэнта ёсць і ўласнае поле — каля вёскі Александрыя Шклоўскага раёна, дзе прайшло дзяцінства і маладыя гады беларускага лідара. Прынамсі, там гэта поле так і называецца — Прэзідэнцкім. Учора кіраўнік дзяржавы вырашыў сабраць ураджай на родным палетку.**

### УРАДЖАЙНАСЦЬ — ФАНТАСТЫЧНАЯ

Праца гэта неафіцыйная, Аляксандр Рыгоравіч прыехаў на поле на квадрацыкле. Прыпыніўся каля паласы пшаніцы, паглядзеў, колькі зерня ў каласах. Паглядзець сапраўды ёсць на што. Імпартнае насенне пасеялі, каб даведацца, якую культура дасць ураджайнасць у нашых умовах, ці зможам мы самі вывесці падобны сорт. Каласы ж — паўнюткія зерня, клоняцца да зямлі. Ды і зерне ўжо спелае і сухое, нібы просіцца, каб сабралі. Учора настала і яго пара.

— Я сёння прыехаў на працу, — проста сказаў Аляксандр Лукашэнка, — і апрануты адпаведна.

Ён растлумачыў, як колішняе калгаснае поле атрымала назву Прэзідэнцкага:

— Гэта сапраўды маё поле. Некалі нехта з лёгкай рукі гэта сказаў. Гэта поле, дзе я працаваў. У мяне ў памяці застаўся яркі ўспамін: першы, калі я сам вадзіў каня, абганяючы бульбу. Было дванаццаць гадзін дня, спёка неймаверная, авадні, мухі... Ураджані не вельмі добрыя на тыя часы, але карысныя для цяперашняга часу.

СТАР. 2

## ЛІЧБА ДНЯ

**Больш за 32 тысячы**

*шматдзетных сем'яў на падрыхтоўку да школы 65,5 тысячы хлопчыкаў і дзяўчатак атрымалі дапамогу да навучальнага года на стане на 14 жніўня. Дзеля гэтага выдаткавана ўжо BYN2,6 млн. У цэлым на гэтыя мэты запланавана выдзеліць BYN6,6 млн. У гэтым годзе такую дапамогу плануецца аказаць 63,6 тысячы шматдзетных сем'яў на 154,7 тысячы навучэнцаў. Па пытаннях выдзялення аднаразовай матэрыяльнай дапамогі да навучальнага года, а таксама аказання дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі ў выглядзе аднаразовай або штомесячнай сацыяльных дапамог неабходна звяртацца ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган па месцы жыхарства.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9383 | ▲ |
| Еўра | 2,2763 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0761 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Занятасць

# «А ЯКІЯ ЯШЧЭ ВАРЫЯНТЫ?»

## Чаму беспрацоўныя ідуць вучыцца на лагістаў

**Каб быць запатрабаваным на рынку працы, трэба пастаянна павышаць кваліфікацыю. А калі твая спецыяльнасць не карыстаецца попытам — асвоіць новую. З пачатку года 6,3 тысячы беларусаў пабывалі на курсах па накіраванні службы занятасці. На перанавучанне ідуць і беспрацоўныя з вышэйшай адукацыяй. Напрыклад, на прафесію лагіста. «Звязда» паразмаўляла з тымі, хто вырашыў зноў сесці за парту.**

### Спрабавалася і на ТБ, і ў адміністратары

У лагісты беспрацоўных бясплатна рыхтуе Рэспубліканскі інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў Мінпрацы і сацабароны. Сёння ў «студэнтаў» экзамен, таму група ў поўным зборы. Ёсць тут і філосафы, і матэматыкі, і лінгвісты. Некаторыя раней займалі кіруючыя пасады на прадпрыемствах.

Вольга Сцяпанава, напрыклад, была намеснікам дырэктара па маркетынгу знешнеэканамічнай дзейнасці на заводзе. Доўга там працавала. Чаму сышла? Жанчына тлумачыць, што на заводзе была цякучка дырэктараў і прэсінг з боку кіраўніцтва. «Я стаpалася, знаходзіла выгадныя кантракты... Але на перыяд звальнення, у 2015-м, атрымлівала фактычна тры мільёны (старымі. — **Аўт.**)!»



Былы памочнік суддзі Святлана БАГДАНАВА.

У Вольгі дзве вышэйшыя адукацыі — эканамічная і лінгвістычная (апошняя, праўда, няскончаная). 21 год працоўнага стажу за плячыма. Але знайсці работу, якая б задаволіла (Вольга шукала месца намесніка дырэктара па маркетынгу), было няпроста. Мінчанка разаслала сваё рэзюме ў кадравыя агенцтвы. Дзе яно толькі ні вісела, успамінае яна, нават на сайце выканкама.

СТАР. 7

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# І нагода для... свята!



**Ірына ВОРАНАВА, дырэктар Музея Марка Шагала ў Віцебску:**

— Для мяне газета «Звязда» заўсёды вылучалася з шэрагу іншых газет. Па-першае, тым, што гэта беларускамоўнае выданне. Па-другое, сваімі публікацыямі на тэмы культуры, мастацтва, гісторыі.

У 2009 годзе беларуская мова апынулася ў спісе ЮНЕСКА як мова, якая трапіла пад пагрозу знікнення. «Звязда» была першай беларускай газетай, што звярнула ўвагу на гэтую праблему на сваіх старонках. На той час я працавала ў Музейным аб'яднанні ў Оршы. Публікацыя «Звязды» падштурхнула нас, музейшчыкаў, ініцыяваць вялікае гарадское свята беларускай мовы.

Зараз мне вельмі прыемна, што на старонках «Звязды» рэгулярна з'яўляюцца публікацыі, прысвечаныя Віцебску і Музею Марка Шагала. Заўсёды з цікавасцю адкрываю свежы нумар газеты, а таксама праглядаю інтэрнэт-сайт zviazda.by ■

# Эксперыменты на палях і незвычайны флэшмоб

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так і атрымалася пасля, што поле стала полем Прэзідэнта.

— А пасля я падумаў: поле Прэзідэнта — значыць, нейкая асаблівасць павінна быць. Яркая асаблівасць бягучага года — эксперымент. Папрасіў пасеяць імпартныя сарты — амаль 300 гектараў пшаніцы, і на суседнім полі, якое знаходзіцца ўжо ў Віцебскай вобласці, — 100 гектараў гібрыднага жыта нямецкага сорту.

Чаму менавіта імпартнае?

— Мне хацелася б сёння да таго, як я пачну работу на сваім полі, пачуць адказ ад вас: ці маем мы нешта падобнае, і калі не, то калі будзем мець? Мне загадзя далажылі, што па пшаніцы ў нас праблем няма. Селекцыя даваляе, мы навучыліся сваё насенне ствараць, і яно па ўраджайнасці, па якасці не горшае, чым імпартнае. Жыта, якое дае ўраджай пад 100 цэнтнераў з гектара, — у нас такога няма. Я паглядзеў даныя па ім, па якасці — цудоўнае жыта.

На эксперыментальных палях былі выкананы ўсе тэхналагічныя працэсы. Як вынік — ураджайнасць дасягнула 90—100 цэнтнераў з гектара. Фантастыка? Рэальнасць. Як напомніў кіраўнік краіны, калісьці на гэтых жа палетках ураджайнасць не перавышала 13—17 цэнтнераў з гектара.

## НЕ ГУБЛЯЮЧЫ ТЭМП

Учора з раніцы было ўбрана ўжо 80% плошчаў краіны. Прэзідэнт яшчэ раз загадаў: у асноўным да 20-га мы павінны ўбраць хлеб:

— Гэта з маёй практыкі — 85—87%. Але спыняцца ні ў якім разе нельга. Таму штурмам прайсціся да 100%, пакуль не ўбяром увесь хлеб. Я бачу, калі надвор'е захаваецца, — нават 90% мы можам на 20-е сабраць. І гэта добра, — сказаў ён.

Па словах Прэзідэнта, нельга спыняцца, апраўдваючыся, нібыта мы ўсё зрабілі.

Пацікавіўся кіраўнік і якасцю сёлетняга ўраджаю лёну. Прэзідэнту паведамілі, што яна вырасла. Усе заводы па льнопераапрацоўцы, якія планавалі мадэрнізаваць, ужо мадэрнізаваныя. Засталося перабудаваць прадпрыемствы ў Хоцімску, Віцебску, Мсціславе. Гэта работа павінна быць скончана да канца наступнага года. Усяго ў краіне будзе працаваць 28 ільноперапрацоўчых заводаў.

— Трэба даводзіць іх да ладу. Па льне мы павінны вызначыцца канчаткова.

Што да рэнтабельнасці гэтай культуры, то з гэтым праблем не ўзнікае. Усё, што вырабляе льнокамбінат, на складзе не залежваецца.

Калі казаць пра рапс, які таксама з'яўляецца папулярнай сельскагаспадарчай культурай у нашым рэгіёне, то кіраўнік дзяржавы папярэдзіў: з рапсам трэба быць асцярожнымі.

— Трэба выразна разумець, дзе яго пасеяць. А так ён то вымакне, то высахне...

Ужо, дарэчы, настаў час клапаціцца і пра наступны год — сеяць, каб і ў 2018-м быў добры ўраджай. Дарэчы, мы ўжо сабралі столькі збожжа, колькі за ўвесь мінулы год. Але сёлета — гэта яшчэ далёка не ўсё.

## ХТО ДОБРА ПРАЦУЕ...

Гаворачы пра вядзенне гаспадаркі, пра перадачу земляў, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў такіх выпадках павінны ўлічвацца інтарэсы людзей. Ён падкрэсліў:

— Зямлю асобна мы не аддаём. Бярэш зямлю — бярэш вёскі, фермы. А што ж будуць людзі рабіць?.. Зямлю аддамо тым, хто добра працуе. Гэта першае. Другое, людзі — гэта перш за ўсё. За вёскай трэба сачыць, за яе трэба адказваць.

Па сутнасці, для гаспадаркі гэта праца невялікая — падтрымліваць у парадку населены пункт, дапамагаць пры неабходнасці вяскоўцам.

Яшчэ адзін нюанс, на якім спыніўся кіраўнік краіны, — калі ёсць гаспадаркі, якія гатовы абрабляць зямлю ў розных абласцях, не трэба іх абмяжоўваць.

— Краіна — адна, — заявіў Прэзідэнт. — Сёння ўжо ў Расіі, у Амерыцы можаш выкупіць участак, і гэта будзе тваё. А тут глядзяць, маўляў, гэта Віцебская вобласць, а гэта Магілёўская. Розніцы няма.

## НАШЫ КАМБАЙНЫ НЕ ГОРШЫЯ

Айчынная сельскагаспадарчая тэхніка — у прыватнасці зерняўборачныя камбайны — таксама цікавіла Аляксандра Лукашэнку. Кіраўніку краіны прадэманстравалі найноўшы ўзор камбайна «Палессе» — КЗС-1624-1. Гэтая машына — на верхняй прыступцы мадэльнага рада «Палесся». Аляксандр Лукашэнка прапанаваў выпрабаваць тэхніку на практыцы.

— Я хачу праверыць, які гэты камбайн у эксплуатацыі, — растлумачыў Прэзідэнт. — Таму што ў прамысловцаў ёсць звычка чшоі надзімаць, што ў нас добрыя камбайны, не горшыя за замежныя аналагі. Праверым, як ён будзе на фоне іншых працаваць, каб людзі бачылі.

Кіраўнік краіны звярнуўся да пастулата: многае залежыць ад чалавека, у дадзеным выпадку — ад механізатара. Айчынная тэхніка ў стане дэманстраваць вынікі не горшыя, чым замежная.

Разам з камбайнерам у кабіну сеў малодшы сын Прэзідэнта Мікалай. Аляксандр Лукашэнка падняўся на пляцоўку каля кабіны.

Пасля выпрабаванняў машыны — дарэчы, менавіта ўчора Мікалай Лукашэнка намалаціў свае першыя пяць тон — надышоў час майстар-класа ад Прэзідэнта. Яго Аляксандр Лукашэнка вырашыў правесці пасля таго, як журналісты арганізавалі своеасаблівы флэшмоб і прыйшлі на поле у вышымайках. Удзельнікамі незвычайнага ўрока сталі не толькі журналісты, але і прадстаўнікі мясцовай вертыкалі ўлады, і высокія службовыя асобы — у прыватнасці, Міхаіл Русы, намеснік прэм'ер-міністра.

**Надзея ЮШКЕВІЧ,** *yushkevich@zviazda.by*
*Шклоўскі раён.*

■ Блізкая ўлада

# РАГУЛЯ Ў АРЭНДУ

**Вясковец прапанаваў калгасу забраць карову на ферму, але толькі на зіму**

**На асабісты прыём грамадзян, які правёў у Клецку старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА, запісаліся пяць чалавек. Першы на чарзе — жыхар раёна Мікалай Пятровіч.**

— Я трымаю трох дойных кароў, двух цялят, — гаворыць мужчына. — Прасіў дырэктара, каб адну з рагуль паставіць на зіму ў кароўнік, а вясной забраць назад, ды ён не пагадзіўся.

— І правільна зрабіў. Жывёліна не прайшла ветэрынарны кантроль. Ці мала якія захворванні можа мець. Падругое, яна не прывучана да ўтрымання ў статку, аўтаматычнай дойкі, — адказаў старшыня Мінаблвыканкама.

Ураган пашкодзіў дах дома. Дасталася ад стыхіі і мясцовай ферме. Шабашнікі, што ліквідавалі яе наступствы, дазволілі грамадзяніну ўзяць тры лісты старога шыферу. Але давесці дадому ўдалося толькі адзін. «Наляцелі міліцыя, начальнік участка, сказалі: па астатнія нават не хадзі», — крыўдуе заяўнік.

У такім выпадку неабходна звяртацца да кіраўніка гаспадаркі, які павінен выдзеліць будаўнічыя матэрыялы, параіў старшыня Мінаблвыканкама.

У агракамбінаце «Клецкі» падчас стыхіі раскрыла восем дамоў. «Мы кінулі ўсе сілы, каб дапамагчы насельніцтву: падключылі сельгаспрадпрыемства, райспажыўсаюз, арганізацыі раёна. Усёй грамадой ліквідавалі непаладкі. У нас з гэтым ніколі не было праблем», — падкрэсліў Генадзь Салавей.

Анатоль Ісачанка даручыў выдаць грамадзяніну два лісты шыферу, якіх не стае.

Хрысціна Жукоўская і яе муж з 2014 года стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, з лістапада 2016-га — у статусе шматдзетнай сям'і. Яны хацелі ўзяць ільготны крэдыт для куплі дома. Але ім адмовілі. Прапанавалі два варыянты: гатовы дом у сельскай мясцовасці, а таксама будаўніцтва кватэры па дзяржзаказе.

— У нас трое непаўналетніх дзяцей, адно з іх вельмі хворае, неадназрасова ляжалі з ім у бальніцы. Пераехаць у вёску мы не можам, паколькі малому патрэбна медыцынская дапамога.

— Медыцынскае заключэнне ў вас ёсць? — пацікавіўся Анатоль Ісачанка.

— Так, дыягназ не зняты, але інваліднасці нам не далі, паколькі захворванне не прагрэсіруе, — адказала жанчына.

— Я не проста так пытаю. Калі ёсць інваліднасць, то вы маеце права на іншае жыллё, — заўважыў губернатар.

Заадно Анатоль Ісачанка пацікавіўся, ці падабралі сужэнцы дом.

Сям'ю пусціла часова пажыць сваячка з умовай, што будуць прыглядаць за домам. Гаспадыня збіраецца прадаць жыллё і прапанавала набыць яго кватарантам. «Калі мы не выкупім, то нас папросяць выселіцца, — кажа маладая маці. — Дом плошчай 110 квадратных метраў, ёсць цэнтралізаваная каналізацыя, ацяпленне. А пабудаваць свой мы не зможам — няма каму дапамагаць».

«Сапраўды, па заканадаўстве льготны крэдыт шматдзетным выдаецца не на куплю дома, а на будаўніцтва. Але з улікам гэтай сітуацыі я даручу спецыялістам дадаткова вывучыць пытанне і даць вам адказ. Думаю, на працягу двух тыдняў разбяромся», — паабяцаў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна.

Губернатар уважліва выслухаў кожнага заяўніка. Праблемы адных вырашылі на месцы. Іншым будзе дадзены афіцыйны адказ пазней, паколькі сітуацыя патрабуе дадатковага вывучэння.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Абітурыент-2017

# У пашане — слесары і цырульнікі

**20 жніўня завяршаецца афіцыйна адведзены тэрмін прыёму дакументаў ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.**

Сёлета прыём па 251 рабочай прафесіі ажыццяўляюць 146 устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі і 49 устаноў адукацыі іншых узроўняў, якія таксама рэалізуюць праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Усяго плануецца набраць 29,9 тысячы чалавек, што складзе 93,6 працэнта да прыёму 2016 года (на 2 тысячы чалавек менш), у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту — 29,7 тысячы чалавек.

За два дні да заканчэння прыёму дакументаў ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі ўжо пададзена 26,7 тысячы заяў, або 96,3 працэнта ад запланаваных кантрольных лічбаў прыёму. Па словах **кансультанта ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Таццяны АРЦЕМ'ЕВАЙ**, на некаторыя рабочыя спецыяльнасці конкурс даходзіць да двух чалавек на адно месца. Папулярнасцю ў моладзі карыстаюцца такія прафесіі, як апаратар камп'ютарнай графікі, цырульнік, повар, кандытар, машыніст аўтамабільнага крана, слесар па рамонце аўтамабіля, электраманцёр ахоўна-пажарнай сігналізацыі, кіроўца аўтамабіля са спецыялізацыяй «міжнародныя перавозкі» і ўсе прафесіі Беларускай чыгункі. Але ёсць спецыяльнасці, якія запаўняюцца з цяжкасцямі. Таму калі да 20 жніўня не ўсе планавыя месцы будуць запоўнены, установа адукацыі па ўзгадненні з заснавальнікам можа падоўжыць тэрмін прыёму дакументаў да поўнага ўкамплектавання груп, але не пазней чым да 15 верасня бягучага года.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# «Я не баюся!»

## КАТАЛОНСКІЯ ТЭРАКТЫ АДАБРАЛІ ЖЫЦЦІ 14 ЧАЛАВЕК

**Страшныя навіны прыйшлі з Іспаніі: днём 17 жніўня на галоўнай турыстычнай вуліцы Барселоны Рамбла грузавы мікрааўтобус на хуткасці каля 80 кіламетраў за гадзіну ўехаў у натоўп прахожых. Фургон праехаў каля 600 метраў. Па звестках радыё Cadena SER, загінулі 13 чалавек, больш за 100 пацярпелі, не менш як 15 знаходзяцца ў цяжкім стане. Паліцыя, якая прыбыла на месца здарэння, практычна адразу заявіла, што адбыўся тэракт.**


lenta.ru

Кіроўца фургона забарыкадаваўся ў найбліжэйшым рэстаране і ўзяў у заложнікі супрацоўнікаў і наведвальнікаў. З ім вяліся перагаворы, аднак пазней стала вядома, што падазраванаму ўдалося ўцячы.

Позним вечарам таго ж дня паліцыя паведаміла пра двух затрыманых. Адзін з іх з'яўляецца грамадзянінам Іспаніі, другі — выхадцам з Марока. Па інфармацыі выдання El País, другога чалавека завуць Дрыс Укабір. На наступны дзень стала вядома аб трэцім затрыманым.

Менавіта Дрыс Укабір быў аб'яўлены ў вышук як непасрэдны выканаўца тэракта ў Барселоне. У фургоне знайшлі дакументы на яго імя. Ён з'явіўся ў паліцыю сам, калі ўбачыў свае фатаграфіі ў СМІ, і заявіў, што яго дакументы былі ўкрадзены. У крадзяжы падазраецца 18-гадовы брат Укабіра, Муса.

Праз некаторы час пасля тэракта ў Барселоне стала вядома аб выбуху, які ў той жа дзень адбыўся ў каталонскім горадзе Альканар. У заяве паліцыі сказана, што выбух адбыўся ў працэсе вырабу ўзрыўчаткі. Крыху пазней паліцэйскія заявілі аб наяўнасці доказаў сувязі барселонскага тэракта і выбуху ў Альканары. Таксама з'явілася інфармацыя аб другім выбуху ў гэтым жа горадзе.

Ноччу на 18 жніўня ў каталонскім горадзе Камбрыльс, які знаходзіцца за 120 кіламетраў на паўднёвы захад ад Барселоны, тэрарысты на аўтамабілі зноў выехалі на пешаходную зону і збілі некалькі чалавек, але іх спыніў паліцэйскі кардон. Пацярпелі пяць чалавек, адна жанчына загінула. У выніку перастрэлкі адзін паліцэйскі застрэліў чацвярых тэрарыстаў, яшчэ адзін злачынец у цяжкім стане быў дастаўлены ў шпіталь — пазней стала вядома, што ён памёр у бальніцы. Па звестках паліцыі, магчыма, адзін з забітых у Камбрыльсе быў за рулём фургона, які збіваў людзей у Барселоне.

У іспанскіх праваахоўных органаў ёсць версія, што тэракты падрыхтавала ячэйка з 12 тэрарыстаў.

У твітар-акаўнце Міністэрства замежных спраў Беларусі з'явілася інфармацыя, што сярод пацярпелых у Барселоне беларусаў няма. У паведамленні таксама гаворыцца, што пасольства працягне адсочваць сітуацыю ў Іспаніі. МЗС рэкамендуе беларусам выконваць указанні ўладаў, а таксама звязацца з роднымі і блізкімі. Тэлефон гарачай лініі, адкрытай уладамі Іспаніі: +34902400012. Таксама створана дадатковая гарачая лінія для ўдакладнення інфармацыі аб пацярпелых у выніку тэракта ў Барселоне: +34900400012. У сувязі з тэрарыстычнымі актамі ў Іспаніі ў пасольстве Беларусі ў Мадрыдзе адкрыты тэлефон гарачай лініі: +34645577379.

Вядома, што сярод пацярпелых ёсць адна грамадзянка Расійскай Федэрацыі. Як паведамляе РІА «Навіны», такая інфармацыя была атрымана ў прэс-службе Растурызму. Іспанскія праваахоўныя органы, у сваю чаргу, заявілі аб тым, што ў тэракце загінулі і пацярпелі грамадзяне як мінімум 18 краін — Аўстраліі, Алжыра, Аргенціны, Бельгіі, Венгрыі, Венесуэлы, Германіі, Грэцыі, Ірландыі, Італіі, Іспаніі, Кітая, Кубы, Македоніі, Нідэрландаў, Перу, Румыніі і Францыі.

Адказнасць за тэракт у Барселоне ўзяла на сябе Ісламская дзяржава. Колькасць падобных здарэнняў значна ўзрасла пасля тэракта ў Ніцы ў 2016 годзе. З таго моманту падобным чынам тройчы быў атакаваны Лондан, аднойчы — Парыж, Берлін і Стакгольм.

У Іспаніі абвясцілі трохдзённую жалобу. Учора ў Барселоне адбылася хвіліна маўчання ў памяць аб загінулых. На плошчу Каталоніі прыйшлі тысячы людзей, сярод іх былі прэм'ер-міністр Іспаніі Марыяна Рахой і кароль Філіп VI. Калі акцыя завяршылася, людзі сталі апладзіраваць і скандзіраваць «Я не баюся!».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

■ З прыстаўкай «нана-»

# СОНЕЧНЫЯ БАТАРЭІ, ФІЛЬТРЫ, УГНАЕННІ

## Якія кірункі нанатэхналогій развіваюцца ў Беларусі?


Фота БЕЛТА.

**Галоўная праблема айчыннай нанаіндустрыі заключаецца ў складанасці пераносу новых тэхналогій на прамысловыя «рэйкі», мяркуе першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей ЧЫЖЫК. Тым не менш за апошні час у гэтай сферы было выканана некалькі этапаў дзяржаўных праграм, рэалізавана каля ста праектаў. Іх асаблівасць у тым, што нанатэхналогіі з'яўляюцца міждысцыплінарнай сферай — гэта індустрыя развіваецца паасобку ў розных кірунках навукі: электроніцы, матэрыялазнаўстве, энергетыцы, медыцыне, аграхіміі і іншых.**

— Цікавых распрацовак у нас хапае, — адзначыў спецыяліст. — Мы можам з гонарам сказаць, што ў Беларусі пачалі вырабляць зыходныя элементы для сонечнай энергетыкі. Іх выпускае адно з прыватных айчынных прадпрыемстваў. Яны маюць неблагі ККД — каля 25 працэнтаў. Сусветныя аналагі паказваюць трохі вышэйшы вынік — 27—29 працэнтаў, але і гэта ўжо вельмі добры ўзровень. Хацелася б, каб мы яшчэ асвоілі вытворчасць такіх элементаў на гнуткай падкладцы, гэта адкрыла бы для нас вялікую колькасць новых сфер прымянення. Таксама вылучыў бы беларускае ўгнаенне «Нанаплант» — яно ўжо выйшла на прыбалтыйскі і скандынаўскі рынкі, прайшло праверку ў лабараторыі ў Мюнхене, якая пацвердзіла заяўленыя намі ўласцівасці. Гэты прадукт дае значны эфект у раслінаводстве. Дарэчы, насельніцтва можа знайсці яго ў адкрытым доступе ў крамах.

Сяргей Чыжык расказаў і пра іншыя распрацоўкі ў сферы НТ. Гэта, напрыклад, фільтры для ачысткі вады — шматузроўневыя мембраны, на поры якіх наносяць тонкія слаі рэчываў, што надаюць ім новыя ўласцівасці, напрыклад гідрафобныя ці гідрафільныя. Так, на айчынных газавых станцыях такія фільтры ўжо выкарыстоўваюцца для першаснай ачысткі прыроднага газу ад староннях вадкасцяў.

Яшчэ адзін трэнд — электратранспарт. У НПЦ НАН па матэрыялазнаўстве на базе нанатэхналогій ствараюцца накапляльнікі энергіі (суперкандэнсатары) — у іх аснове ляжаць графенавыя пласціны, якія дазваляюць накапіць вялікі аб'ём энергіі. Апроч таго, сам кандэнсатар мае вельмі нізкую вагу. Яшчэ адзін кірунак — адытыўныя тэхналогіі і, у прыватнасці, 3D-друк. У НАН лічаць, што матэрыялы для гэтага друку могуць стаць наваструктурнымі, што дазволіць надаваць новыя ўласцівасці гатовым вырабам. Так, у медыцыне вынікам развіцця гэтай тэхналогіі можа стаць друк клеткамі і біячарніламі.

У развіцці сферы нанатэхналогій у Беларусі задзейнічаны шэраг арганізацый. Сярод іх вылучаецца Рэспубліканская асацыяцыя нанаіндустрыі (РАНІ) — добраахвотнае аб'яднанне камерцыйных і некамерцыйных юрыдычных асоб, якія працуюць у сферы НТ і зацікаўлены ў яе прасоўванні ў нашай краіне, а таксама прадстаўленні сваіх інтарэсаў на ўзроўні органаў дзяржаўнага кіравання. Цяпер у асацыяцыю ўваходзіць каля 30 арганізацый.

— Мы ставім перад сабой чатыры глабальныя задачы, — расказаў **выканаўчы дырэктар РАНІ Аляксей ТРУХАНАЎ**. — У першую чаргу гэта экспертная функцыя — правядзенне маніторынгу рынку нанатэхналогій і нанаіндустрыяльнай прадукцыі, а таксама далейшая распрацоўка прапаноў для дзяржавы, якія будуць спрыяць развіццю НТ-сферы. Іншая задача — аналітычная, гэта выяўленне попыту на нанатэхналагічную прадукцыю на ўнутраных і знешніх рынках. Адзначу, што найбольш развітыя краіны, такія як ЗША, Японія, Паўднёвая Карэя і Германія, на працягу папярэдняга дзесяцігоддзя пастаянна павялічвалі аб'ём інвестыцый у НТ-сектар. Лідарамі па росце з'яўляюцца такія адгалінаванні, як радыёэлектронная і паўправадніковая прамысловасць, мікраэлектроніка, фармацэўтыка, авіякасмічная і лёгкая прамысловасць. Наступная функцыя — арганізацыйна-інфармацыйная: мы каардынуем сумесныя праекты, праводзім інфармацыйную падтрымку ўсіх членаў РАНІ, павышаем узровень кваліфікацыі супрацоўнікаў НТ-сферы праз семінары і трэнінгі. Маем праект з Міністэрствам адукацыі — хочам, каб нашы члены выступалі экспертамі пры распрацоўцы новых адукацыйных курсаў у галіне нанатэхналогій. Апроч гэтага, пашыраем сувязі паміж рознымі арганізацыямі ў Беларусі, а таксама з калегамі з замежжа.

Як адзначыў **начальнік упраўлення навукова-тэхнічных праграм Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей КАБІШОЎ**, праз ДКНТ у першую чаргу праходзяць праекты, якія накіраваны на атрыманне канкрэтных вынікаў. Паводле слоў эксперта, цяпер нанатэхналогіі, што прайшлі апрабацыю ў лабараторыях, пачынаюць выходзіць на прамысловы ўзровень. Для таго каб не «даганяць цягнік», трэба ўліцца ў супольнасць краін, у якіх нанаіндустрыя знаходзіцца на высокім узроўні. Сяргей Кабішоў упэўнены, што ў Беларусі для гэтага ёсць усе магчымасці. ДКНТ, са свайго боку, гатовы аказаць неабходную падтрымку, у тым ліку фінансавую, калі будзе гарантыя значных вынікаў. Цяпер Нацыянальная акадэмія навук рыхтуе галіновую навукова-тэхнічную праграму па нанатэхналогіях. Дакумент знаходзіцца на ўзгадненні ў Дзяржаўным камітэце. Магчыма, ужо ў наступным годзе будуць вядомы канкрэтныя кірункі работы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Будзьце пільныя!

# Пагроза наспявае ў цішыні

## Змеі кусаюць, калі бачаць у нас агрэсара

**Гэты жнівень ужо адзначыўся тым, што ў гарадах змеі пакусалі некалькі чалавек. Не стаў выключэннем і Мінск, дзе гадзюку ўбачылі нават на газавай пліце адной з кватэр звычайнай шматпавярхоўкі. Аднак сустрэць змяю ў такім доме — гэта вялікая рэдкасць. Куды большая верагоднасць знайсці нечаканы «сюрпрыз» у доме прыватным, бо рэптыліі трапіць туды значна прасцей.**



Такі выпадак здарыўся ў пачатку жніўня ў Чэрвені. Гаспадыня прыйшла на кухню і ўбачыла, што там з'явілася непажаданая госця. Разлік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях тут жа выбыў на месца і злавіў змяю.

— Калі ў вас дома з'явіўся паўзун, то не трэба спрабаваць ад яго пазбавіцца самастойна — забіць кіем або каменем, — раіць **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Настасся ШВАЙБОВІЧ**. — Змеі — жывёлы драпежныя і атакуюць тады, калі бачаць у вас пагрозу. Прычым хуткасць рэакцыі ў іх вельмі вялікая. Таму адзінае выйсце — гэта шчыльна зачыніць пакой, пакінуць дом і патэлефанаваць па нумары 101.

Болей за ўсіх церпяць ад небяспечных паўзуноў тыя, хто ходзіць у лес у ягады і грыбы. Яно і зразумела: заўважыць доўгую стужку ў зялёным хмызняку вельмі цяжка.

— Вось зараз у нас на лячэнні знаходзяцца дзве пацярпелыя ад рэптылій. І перадгісторыі ў іх аднолькавыя: пайшлі ў лес па грыбы-ягады і не заўважылі сярод зеляніны змяю. Часцей за ўсё змеі цэляць у рукі і ногі. Самымі небяспечнымі ўкусамі лічацца тыя, якія прыйшліся ў галаву і шыю, — кажа **выконваючы абавязкі загадчыка таксікалагічнага аддзялення Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мінска Вольга СОЛТАН**. — Адметна, што да атруты гадзюкі дзеці і пажылыя людзі куды больш успрымальныя. Таксама ступень наступстваў укусу залежыць ад таго, наколькі моцны ў пацярпелага імунітэт. У сярэднім на стацыянарным лячэнні ў бальніцы пасля зубоў гадзюкі даводзіцца правесці ад 7 да 10 дзён. Яе атрута ўтрымлівае рэчывы, якія разбураюць сценкі крывяносных сасудаў і ўтвараюць у іх тромбы.

У Беларусі водзяцца тры віды змей. Самы мірны з іх — вуж. Ад чалавека ён заўжды імкнецца ўцячы. Аднак можа і ўкусіць — калі вы яго злавілі. Мядзянка звычайная сустракаецца даволі рэдка і занесена ў Чырвоную кнігу. Смяротна небяспечным яе ўкус не з'яўляецца, але ўрачу паказацца пасля яго ўсё ж трэба абавязкова. А вось гадзюка дастаўляе больш за ўсіх непрыемнасцяў. Больш за ўсё змеям падабаюцца месцы забалочаныя, дзе зацішна і шмат вады, а таксама хмызняку. Адсюль яны і паўзуць у населеныя пункты.

Адрозніць іх не складана. Цёмна-шэрая скура гадзюкі пакрыта светлым зігзагападобным узорам. Ён нечым падобны на пратэктары шын. Мядзянка мае карычневы колер. А вуж — шэры і з жоўтымі плямамі па баках галавы. Між іншым, вужы могуць пасяліцца і на прысядзібным участку. Яны хаваюцца ў смецці, дровах, камянях.

Калі вы ўбачылі змяю ў лесе, то не варта спрабаваць прагнаць яе. Яна палічыць вас за агрэсара і атакуе. Апранацца трэба так, каб максімальна абараніць ногі. Для гэтага лепш за ўсё падыдуць гумавыя боты. Але як быць з рукамі? У зімовых пальчатках у 25-градусную цеплыню хадзіць не будзеш. Таму лепш за ўсё абстукаць дарогу, тэрыторыю каля кусціка або месца, дзе збіраецеся прысесці, кіем. Гадзюкі дрэнна бачаць, але вібрацыю зямлі адчуваюць цудоўна.

### Што ж рабіць, калі пазбегнуць зубоў паўзуна не атрымалася?

— Трэба выцiснуць з месца ўкусу атруту і прамыць яго чыстай вадой, — раіць Вольга Солтан. — Апошнюю ў лесе знайсці не так проста, таму варта ўзяць яе з сабой. Для выціскання атруты лепш за ўсё падыдзе гумавая груша. А вось ужываць жгут мы не рэкамендуем. Дыскусійным з'яўляецца пытанне, ці варта спрабаваць высмактаць атруту. Справа ў тым, што яна вельмі добра ўсмоктваецца са слізістых абалонак у ротавай поласці. І да таго ж у вашага памочніка можа развіцца алергічная рэакцыя.

Пажадана з сабой у лес узяць чысты бінт. З яго можна будзе зрабіць павязку, каб рана не забруджвалася і не гнаілася. І неадкладна выклікайце хуткую дапамогу.

Чым хутчэй вы звернецеся да ўрачоў пасля ўкусу паўзуна, тым меншымі будуць яго наступствы. Нам даводзілася сутыкацца з вельмі бездапаможнымі паводзінамі. Пайшоў грыбнік у лес, яго там укусіла змяя. Ён вярнуўся дадому, сяк-так руку перавязаў, па дапамогу не звяртаўся. Думаў, усё пройдзе. А вось і не. Раніцай ён паступае да нас з ацёкам сінюшнага колеру на палову рукі, якi моцна баліць. І калі не звярнуцца своечасова да медыкаў, то ўкус гадзюкі цалкам можа стаць фатальным...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

# КАГО АБ'ЯДНАЕ НОВЫ ХОЛДЫНГ?

## Замест Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці гэтай восенню пачне функцыянаваць фармацэўтычны холдынг

**Новая сістэма кіравання павінна павысіць эфектыўнасць прасоўвання фармпрадукцыі на знешнім рынку, пазбегнуць неапраўданай канкурэнцыі на ўнутраным. Холдынг па вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі аб'яднае не толькі дзяржаўных вытворцаў, але і прыватных суб'ектаў, прадстаўнікоў аптова-рознічнага гандлю. Дасягнуць аб'яднання намаганняў у межах дэпартамента не ўяўлялася магчымым, паколькі структура не магла прыцягнуць вытворцаў-прыватнікаў.**

Дэпартамент выканаў пастаўленыя перад ім на сёння задачы. Доля лекавых сродкаў на ўнутраным рынку сёлета павінна была скласці ў фінансавым выражэнні 52 працэнты. Па выніках за паўгода гаворка ідзе пра 57 працэнтаў. У стацыянарах у натуральным выглядзе — ва ўпакоўках — гэта ўжо 70—90 працэнтаў.

Як паведаміў намеснік дырэктара Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці — **начальнік упраўлення эканомікі і маркетынгу Міністэрства аховы здароўя Віктар ШЭІН**, беларускія лекі не з'яўляліся спачатку эканамічна выгаднымі для рознічнага гандлю, многія пазіцыі былі нават стратнымі, аднак урэшце ўдалося вырашыць гэта пытанне так, каб не пацярпелі ні вытворцы, ні спажыўцы.

— Было выведзена на рынак Беларусі звыш 700 новых лекавых сродкаў, асвоеных рознымі айчыннымі фармпрадпрыемствамі, а ўсяго айчынныя вытворцы вырабляюць каля 1,5 тысячы найменняў лекаў, — адзначае Віктар Шэін. — Па нашай прапанове многія замежныя партнёры замест прамога ўвозу лакалізавалі сваю прадукцыю на айчынных вытворчых пляцоўках. Гэта адбылося дзякуючы магчымасці вырабу прадукцыі самай высокай якасці — у адваротным выпадку ніводзін буйны вытворца свету ніколі не лакалізаваў бы сваю прадукцыю на прамысловых пляцоўках Беларусі. Па тым жа механізме мы цяпер працуем і ў некалькіх замежных краінах. Гэта новая схема ўзаемадзеяння, доўгачасовага партнёрства.

Тым не менш некаторыя пытанні заставаліся нявырашанымі. Новая структура кіравання вытворчасцю і рэалізацыяй — фармацэўтычны холдынг — заклікана кансалідаваць 35 суб'ектаў вытворчасці лекаў, каб тыя маглі больш упэўнена адчуваць сябе як на ўнутраным, так і на знешнім рынке, адкрываць за мяжой свае прадстаўніцтвы, гандлёвыя дамы.

Фармпрадпрыемствы (а гэта галоўным чынам «Белмедпрэпараты» і Барысаўскі завод медпрэпаратаў) пастаўляюць на экспарт каля 30 працэнтаў прадукцыі. Сёння яна адпраўляецца ў 30 краін свету, аднак у цяперашніх умовах прадпрыемствы канкурыруюць паміж сабой, што істотна паніжае даходнасць самiх вытворцаў, пазбаўляе часткі валютнай выручкі. А ў межах холдынгавай кампаніі плануецца вырашыць, хто што будзе вырабляць і для якіх рынкаў. У структуру холдынга могуць увайсці і суб'екты, якія прафесійна займаюцца прасоўваннем лекавых сродкаў.

Акцыі шасці прадпрыемстваў перададзены ўжо ў кіраванне холдынгавай кампаніі. З іншымі будуць заключацца дагаворы аб аказанні кіраўніцкіх паслуг, пасля чаго холдынг зможа прадстаўляць інтарэсы прыватных фармпрадпрыемстваў у органах улады, за межамі краіны. Прыватнікі пры гэтым не страцяць свайго статусу.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*


**ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах**

Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего Шаферову Вячеславу Ивановичу.

Номер лота, вид выставляемого на торги имущества: Лот №1, объект: легковой автомобиль.

Наименование, начальная цена, место нахождения: легковой автомобиль «Пежо 406», 2000 года выпуска, заводской номер VF38BRHYE81065110, в количестве 1 шт., начальная цена – 640 белорусских рублей, место нахождения – стоянка ОАО «Райагросервис», пос. Дачный.

Имеющиеся обременения в отношении имущества – без обременений.

Место, дата и время проведения торгов: г. Орша, ул. А. Островского, 36, каб. 12; 5 сентября 2017 г. в 10.00.

Справочная информация: Рожанская Кристина Викторовна, судебный исполнитель, тел.: 8 (0216) 543212, 8 (033) 399-60-53, отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, адрес: ул. А. Островского, 36, г. Орша, адрес электронной почты opi_orsha@tut.by.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 31 сентября 2017 г. на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши №BY22AKBB36429030007942200000, филиал №215 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Орша, код AKBBBY21215.

Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).

В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

■ Узброеным Сілам — 100 гадоў

# Каця і Джэсі

## Гэтых дзвюх сябровак у кіналагічным цэнтры Узброеных Сіл ведаюць усе



**Каця і Джэсі зрэдку ходзяць паасобку. Яны разам і днём, а часам і ноччу: удасканальваюць баявую падрыхтоўку, побач падчас прыёмаў ежы, яны ходзяць у грыбы і нават начуюць у адной кватэры! Не кожны з нас можа пахваліцца такімі адданымі сябрамі. Каця — кінолаг, а Джэсі — нямецкая аўчарка.**

### САБАКУ ПАДБІРАЮЦЬ ПА ТЭМПЕРАМЕНЦЕ

Кацярына Макарэвіч у кіналагічным цэнтры зусім нядаўна. Джэсі — яе першынец. Затое ў сабакі дагэтуль былі іншыя гаспадары. Праўда, пра гэта ўжо наўрад ці памятае. Жывёла настолькі прывязалася да Каці, што, калі яе няма на службе, нават есці не хоча.



— Калі я здавала дзяржаўныя экзамены, патэлефанавалі байцы і сказалі, што Джэсі галадае ўжо чатыры дні, — расказвае кінолаг. — Мне нават іспыты на суткі перанеслі! Я прыехала, забрала сабаку дамоў, правяла з ім два дні, і быццам бы праблема вырашылася. Джэсі проста сумавала...

Як кажуць спецыялісты, чатырохногага сябра чалавеку трэба падбіраць па тэмпераменце. Усё, як у людзей: не з кожнай жывёлай можна сысціся характарам. Каця з Джэсі палюбілі адна адну з першага погляду. Абое — халерыкі.

— У першы ж дзень, калі сустрэліся, пайшлі гуляць без павадка, — успамінае Кацярына. — Яна адразу пачала мяне слухаць, выконваць каманды. Такога не было, каб мы прывыкалі адна да адной.

### ГАЛОЎНАЕ, КАБ БЫЎ ГАСПАДАР

Джэсі пайшоў шосты год. Для сабакі — узрост сур'ёзны. Калі перавесці на чалавечыя гады, то ёй крыху за сорак.

На «пенсію» службовых сабак адпраўляюць па дасягненні васьмі гадоў. Але пры ўмове, што яны не здольныя выконваць свае прафесійныя абавязкі. Калі ж чатырохногі сябар па-ранейшаму з лёгкасцю адшукае чалавека, распазнае наркатычнае або выбуховае рэчыва, бездакорна ахоўвае пэўныя аб'екты, то на «адпачынак» яго пакуль адпраўляць рана.

Кацярына даўно для сябе вырашыла: калі Джэсі будзе ўжо ні на што не здольная ў прафесійным плане, то забярэ яе дамоў. Нават у аднапакаёвую кватэру, у якой разам з сям'ёй жыве цяпер.

— Сабаку галоўнае, каб гаспадар быў побач, а дзе яму жыць — у кватэры ці ў доме — не мае вялікага значэння, — лічыць Кацярына Макарэвіч. — Джэсі ўжо член нашай сям'і. Мая дачка Насця яе вельмі любіць. Тая будзіць малую ў дзіцячы садок: у Джэсі гэта лепш атрымліваецца. Аўчарка начуе ў нас тры-чатыры разы на тыдзень. Імкнуся, каб яна як мага менш знаходзілася ў вальеры: гэта тое ж самае, калі чалавека ў кватэры замкнуць і нікуды не выпускаць.

Каціна дачка як толькі з Джэсі не гуляе: і вярхом на ёй ездзіць, і робіць імправізаваныя ўколы. Сабаку, можа, гэта і не вельмі падабаецца, але чапаць дзіця ён ніколі не будзе. Апусціць вочкі, і ўсё на гэтым.

— Калі мы ідзём па горадзе, многія здзіўляюцца: чаму без намордніка? — кажа ваеннаслужачая. — Я заўсёды адказваю, што службовы сабака на людзей не кідаецца. Любы чалавек можа да яго падысці і пагладзіць. Джэсі не будзе агрэсіўнай, пакуль ёй не дасі спецыяльную каманду.

### «НЕ ЖАНОЧЫХ ПРАФЕСІЙ НЕ БЫВАЕ»

Родам Кацярына з Карэліч. У яе сям'і вайскоўцаў ніколі не было. Адкуль такая любоў да арміі — і сама не ведае. «Можа, што ўсё дзяцінства з хлопчыкамі гуляла, — разважае яна. — У «вайнушкі», машынкі...»

Па адукацыі Каця — аграном. Але ў сельскай гаспадарцы працавала толькі па размеркаванні. Неяк пасля аднаго спаборніцтва па рукапашным баі, у якім яна ўдзельнічала, дзяўчыне прапанавалі паспрабаваць свае сілы ў войску. Тая і пагадзілася.

Азы ваеннай навукі спасцігала ў 50-й змешанай авіяцыйнай базе. Спачатку была чарцёжнікам апературыйнага аддзялення штаба, потым ёй даверылі пасаду начальніка склада аўтамабільных запчастак.

— Не жаночых прафесій не бывае, — перакананая Каця. — У 50-й авіябазе служаць жанчынылётчыцы, ёсць жанчыны і ў міліцыі, у цяжкай атлетыцы, яны ж выдатныя хірургі. А колькі сярод мужчын кухараў і акушэраў! Кожная прафесія ў аднолькавай меры і мужчынская, і жаночая. Галоўнае, каб чалавеку падабалася тое, чым ён займаецца, і каб ён быў на сваім месцы.

### У ПОШУКАХ... ГРЫБОЎ

Джэсі — жывёла вышуковая. Можа знайсці чалавека як па следзе, так і па паху. «Мы з ёй нават грыбы збіраем, — расказвае старшы сяржант. — Даю грыб панюхаць — яна шукае. У асноўным, баравікі, чырвонагаловікі. Праўда, бывае, і на неядомыя прывядзе. А нядаўна трапілі на лісічкі: толькі адвараных у выніку тры з паловай кілаграмы атрымалася!»



Сама Джэсі грыбы не ўжывае. Яе любімая страва — курыца. У цэнтры сабаку кормяць двойчы на дзень: снядане і вячэра — па 325 грам. «Дома Джэсі смачненькім пешчу, — прызнаецца кінолаг. — У цэнтры здаровыя сабакі харчуюцца сухім кормам. Гэта тое ж самае, калі б мы ўвесь час елі адны булачкі. А яе і вадкай ежай кармлю, мясам. Яна ж, як чалавек: усё разумее. Заахвоціш, адпаведна потым і аддача ад сабакі іншая».

— А Джэсі хварэе? — цікаўлюся.

— Пры мне, на шчасце, такога не было, — кажа Каця. — Але, каб вы ведалі, у сабак такія ж хваробы, як і ў людзей: насмарк, атыт, кан'юнктывіт... Калі кусаюць кляшчы, то энцэфаліт. І лечацца яны амаль тымі ж лекамі, што і мы.

— Джэсі — мама?

— Не, — кажа кінолаг. — Для таго, каб яна нарадзіла, трэба на паўгода выключыць яе з работы. Цяжарную ж жанчыну на пошук не адправіш! Так і тут. Прычым пры цяжарнасці патрэбны спецыяльнае харчаванне, адпаведны догляд. А што рабіць, калі вучэнні? У людзей усё значна прасцей...



### НЕЛЬГА БЕЗ ЛЮБОВІ

Падчас дрэсіроўкі мілая Кацярына ператвараецца ў строгага камандзіра. Гэта яна дома — добрая і мяккая. У арміі ж — дысцыпліна. Акрамя таго, што на службе старшы сяржант Макарэвіч займаецца выхаваннем свайго гадаванца, яна вучыць маладое пакаленне азам кіналогіі.

— Але каб быць кінолагам, трэба любіць сабак. Няўжо любові можна навучыць? — удакладняю.

— Нельга навучыць любіць у прынцыпе, — лічыць Каця. — Але мне здаецца, што няма людзей, якія б увогуле не любілі жывёл. Гэтае пачуццё само прыходзіць. Калі бачыш адданыя вочы жывёліны, без любові проста нельга.

... Падыходзім да вальераў. Джэсі прыкметна засумавала. «Гэтым яна паказвае, што з намі ёй добра і ў свой домік яна ісці не хоча», — тлумачыць кінолаг. Па дарозе да Джэсінага жытла спыняемся: Кацярына знаёміць нас са сваім другім гадаванцам. Партос — яшчэ шчанюк, хоча, каб з ім пагулялі. Джэсі становіцца яшчэ больш сумнай — раўнуе. Сабакі ж, як людзі, усё разумеюць...

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ**

■ Армейскі дайджэст

## У ПЯЦЁРЦЫ!

Па выніках «Армейскіх міжнародных гульняў — 2017» зборная Беларусі заняла чацвёртае месца

**Пры гэтым нашы ваеннаслужачыя абышлі прадстаўнікоў наймацнейшых армій свету — Ірана, Індыі, Ізраіля... У выніковым рэйтынгу за беларускімі вайскоўцамі — людзі ў пагонах з 24 краін!**

І гэта нават нягледзячы на тое, што з 28 конкурсаў нашы ваеннаслужачыя ўдзельнічалі ў 13-ці. Але гэта не перашкодзіла ім адзінаццаць разоў падняцца на п'едэстал. «Золата» айчынный зборнай прынесла перамога нашых вайскоўцаў у конкурсе ваенна-прафесійнага майстэрства «Воін Садружнасці — 2017».

У найбольш відовішчным конкурсе гульняў — «Танкавым біятлоне» — беларускія вайскоўцы абагналі танкістаў з 15 краін свету. Больш хуткімі за іх аказаліся толькі расіяне, казахі і кітайцы.

## НАПЕРАДЗЕ — «ЗАХАД-2017»

Падрыхтоўка да сумеснага стратэгічнага вучэння на стадыі завяршэння

**Неўзабаве распачнецца вучэнне Узброеных Сіл Беларусі і Расіі. Нагадаем, сёлета сваё прафесійнае майстэрства вайскоўцы будуць удасканальваць на беларускай зямлі.**

Для стварэння рэальнай абстаноўкі і адпрацоўкі практычных дзеянняў сіл і сродкаў тылавога і тэхнічнага забеспячэння ў ходзе вучэння ў краіну ўжо прыбываюць вайсковыя часці і падраздзяленні рэгіянальнай групоўкі войскаў (сіл) з расійскага боку. Ужо на днях яны прыступяць да сумеснай з беларускімі калегамі трэніроўкі, падчас якой адпрацоўць комплекс мерапрыемстваў па тылавым і тэхнічным забеспячэнні маючага адбыцца вучэння.

Назіраць за будучым вучэннем запрасілі звыш 80 міжнародных назіральнікаў ад ААН, АБСЕ, АДКБ, Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа, Польшчы, краін Балтыі, Скандынавіі, Украіны, а таксама ваенных аташэ, акрэдытаваных у Беларусі.

## СВЯТА МУЗЫКАЎ У ПАГОНАХ

«Спаская вежа» чакае сяброў з 26 жніўня па 3 верасня

**Міжнародны ваенна-музычны фестываль ужо дзясяты год запар напрыканцы лета — напачатку восені ладзіцца ў Маскве. У маляўнічым шоу, якое праходзіць каля Крамля, разам з ваеннымі музыкамі з розных краін свету традыцыйна будзе здзіўляць публіку і Узорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл Беларусі.**

Фестываль праходзіць пры поўным аншлагу. Каб ацаніць майстэрства музыкаў у пагонах, штогод за перыяд правядзення «Спаскай вежы» Красную плошчу ў сярэднім наведвае каля 300 тысяч чалавек. Арганізатары юбілейнага фестывалю запэўніваюць, што сёлета дзесяцідзённае шоу, якое ўключае сабой выступленні найлепшых ваенна-аркестровых калектываў свету, будзе запамінальным.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Профі

# ЛЕПШЫЯ Ў САДРУЖНАСЦІ

## Зборная Беларусі перамагла ў конкурсе ваенна-прафесійнага майстэрства

**Мінулыя дні сталі спякотнымі для Мінска не толькі з прычыны пякучага летняга сонца, але і ад падзей, якія адбываліся ў сталіцы. На працягу тыдня вайскоўцы з Арменіі, Беларусі, Казахстана і Расіі змагаліся за ганаровае званне — лепшага воіна Садружнасці.**



Сёлета конкурс прафесійнага майстэрства вайскоўцаў быў уключаны ў праграму «Армейскіх міжнародных гульняў — 2017». Падчас знаходжання ў нашай краіне ваеннаслужачыя з іншых дзяржаў маглі не толькі паказаць свой прафесіяналізм, пераняць вопыт калег, але і пазнаёміцца з культурай і гісторыяй Беларусі, традыцыямі нашага горада.

Першы конкурс — «Эрудыт» — выпрабаванне інтэлектуальнае. Удзельнікі паспаборнічалі ў веданні ваеннай гісторыі, ратнай славы і традыцый абаронцаў Айчыны. У выніку найбольш эрудзіраванымі вайскоўцамі аказаліся беларусы. А хто з іх найбольш трапны стралок, ваеннаслужачыя даказвалі падчас выпрабавання па агнявой падрыхтоўцы «Снайпер». Высветлілася, што з аўтаматам Калашнікава найбольш сяброўе прадстаўнік казахстанскай каманды Алжас Ермекаў і — увага! — наша зямлячка Ганна Кавалеўская.

— Кожны член каманды мае вялікае значэнне, — лічыць Ганна. — Змагацца разам — гэта важная і цяжкая адказнасць. Дапамагае тое, што выступаем на сваёй зямлі, адчуваецца падтрымка людзей, якія хварэюць душой за нашу каманду. Мужчыны ў камандзе па асабліваму ставяцца да мяне (па ўмовах конкурсу, кожную каманду прадстаўляюць тры вайскоўцы і адна дзяўчына. — **Аўт.**): і бронекамізэльку паднясуць, і дапамогуць, калі патрэбна.

Зацікавіла, чым жа вабіць ваенная кар'ера дзяўчат? І Ганна раскрыла сакрэт: «Мне заўсёды падабаліся ваенныя людзі, я вельмі час хацела бегаць, страляць. Праца з паперкамі — гэта не для мяне. Ужо ў пятым класе разумела, што хачу насіць пагоны. Спачатку думала быць міліцыянерам, потым вырашыла, што армія мне бліжэй. У маёй сям'і дагэтуль ніхто пагоны не насіў, але бацькі падтрымліваюць маё пачынанні».

Найбольш складаным стаў этап «Атлет». Журы неабходна было вызначыць, хто сярод ваенных кантрактнай службы самы хуткі, спрытны і моцны. Вайскоўцам прыйшлося папацець: бег на розныя дыстанцыі, падцягванні і адцісканні, паласа перашкод і кіданне гранаты. Але нягледзячы на тое, што з кожным разам выпрабаванні станавіліся ўсё больш складанымі, Ганна Кавалеўская не пераставала здзіўляць вынікамі. У гэтай намінацыі беларуска зноўтакі заняла першае месца. А сярод мужчын адзначыўся казах, старшы сяржант Асхат Байдаўлетаў.

Конкурс «Прафесіянал» праверыў удзельнікаў на трываласць і цягавітасць. Як расказаў **старшы афіцэр галоўнага ўпраўлення баявой падрыхтоўкі Узброеных Сіл і галоўны суддзя выпрабавання Сяргей САВІЦКІ,** гэты этап з'яўляецца найбольш складанай часткай у «Воіне Садружнасці». «Конкурс уключае ў сябе шэраг перашкод для праверкі прафесійных навыкаў вайскоўцаў, дэманструе іх уменне ў выкананні нарматываў па баявой падрыхтоўцы і вядзенні агню са стралковай зброі, — гаворыць ён. — Ад кожнага вайскоўца на гэтым этапе патрабуецца максімальнае напружанне сваіх сіл — фізічных і маральных. Для жанчын адзінае пасlабленне: на ўчастку разбуранай лесвіцы ім дазволена не пераадольваць апошнія два бервяны».

Час ішоў на хвіліны: найхутчэй трэба было выканаць нарматывы па баявой падрыхтоўцы і дабегчы да канца, не здацца. І вось яна — фінішная прамая.

Давід Аганесян з Арменіі ў «Воіне Садружнасці» ўдзельнічаў ужо другі раз. Як прызнаўся юнак, у Мінск ён ехаў з баявым настроем. «Падрыхтаваўся як маральна, так і фізічна: быў упэўнены, што чакае годны сапернік, — расказвае вайсковец. — Але ж галоўным сапернікам быў я сам, бо самае складанае — перадолець сябе».

А вось на думку нашага земляка Арцёма Пушнёва, самае складанае — гэта фініш. «Ты разумееш, што да канца табе засталося ўсяго 100 метраў, але сіл ужо няма, а трэба бегчы, — кажа хлопец. — Да конкурсу нястомна рыхтаваўся два месяцы: днём і ноччу. Хацелася б, каб вынікі былі крыху лепшыя, але ўжо як атрымалася (Арцём спыніўся за крок ад лідара і заняў другое месца па выніках конкурсу. — **Аўт.**) Такія мерапрыемствы патрэбныя. Яны дапамагаюць палепшыць фізічныя якасці вайскоўцаў, іх прафесійныя навыкі, згуртоўваюць народы і дзяржавы».

Апошні этап выпрабавання — «Кавалер» («Спадарыня») — прадвызначаў з мэтай выявіць творчыя асаблівасці ваеннаслужачых дружалюбных армій. За кулісамі можна было назіраць некаторых канкурсантаў, якія нервова пераміналіся з нагі на нагу, хадзілі то ў адзін бок, то ў другі. Было зразумела — рыхтаваліся сур'ёзна.

А на сцэне Драматычнага тэатра беларускай арміі ўжо гучалі вершы і песні, былі прадстаўлены танцы, музычная кампазіцыя, выкананая на саксафоне. Вайскоўцы прыклалі ўсе намаганні, каб годна выступіць і праявіць сябе ў якасці артыстаў. І гэта ў іх атрымалася.

На падвядзенні вынікаў IX Міжнароднага конкурсу ваенна-прафесійнага майстэрства ваеннаслужачых дружалюбных армій «Воін Садружнасці» прысутнічаў і міністр абароны Беларусі Андрэй Раўкоў. Першае месца сярод жанчын заваявала наша зямлячка яфрэйтар кантрактнай службы Ганна Кавалеўская, другое — малодшы сяржант кантрактнай службы Лілія Даўтава з Расіі, «бронза» дасталася казашцы, малодшаму сяржанту кантрактнай службы Людміле Губаравай. Сярод мужчын першым стаў старшы сяржант Арынбек Сандыбекаў з Казахстана, «серабро» дасталася беларусу — старшыне Арцёму Пушнёву, прадстаўнік нашай арміі Сяргей Чарноў атрымаў бронзавы медаль.

— Падчас конкурсу яго ўдзельнікі не толькі спаборнічалі ў баявым майстэрстве, а і дакрануліся да святыняў беларускай зямлі, дзе беражліва захоўваецца памяць пра Вялікую Перамогу, — павіншаваў канкурсантаў **генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.** — Конкурс з'яўляецца яркім пацвярджэннем таго, што мы развіваем і ўмацоўваем супрацоўніцтва паміж дзяржавамі на карысць нашых народаў, бяспекі і міру.

**Анастасія ГРУК**

■ Людзі і лёсы

# Подзвіг лагойскіх медыкаў

## Як пад носам у ворага лячылі савецкіх вайскоўцаў

**На фасадзе аднаго з карпусоў Лагойскай раённай бальніцы можна ўбачыць мемарыяльную дошку. Змешчаны на ёй надпіс сведчыць пра мужнасць і вернасць прафесійнаму абавязку ўрачоў і медыцынскіх работнікаў, якія ў варожым тыле, у экстрэмальных умовах, лячылі параненых чырвонаармейцаў.**

— Бальніца стала па сутнасці падпольным шпіталем, — расказвае дачка адной з медсясцёр Тамара Сакалова. — Фактычна яе ўзначальвала хірург Марыя Анісімава, якой незадоўга да таго першай у БССР было прысвоена званне заслужанага ўрача рэспублікі. У Марыі Навумаўны была магчымасць эвакуіравацца, але яна засталася: не змагла пакінуць параненых. Па яе просьбе ў бальніцу прыйшлі іншыя медработнікі, у тым ліку мая маці, Марыя Тарайкоўская.

Пасля бою за Лагойск, калі немцы ўжо захапілі пасёлак, у бальніцы было больш за сотню параненых савецкіх воінаў. Да таго як нямецкія салдаты ўварваліся ў бальніцу, урачы і медперсанал паспелі знішчыць вайсковую форму каманднага саставу і прынесці для параненых цывільную вопратку, перапісаць некаторыя гісторыі хваробы. Такім чынам, сярод параненых чырвонаармейцаў стала нямала «цывільных» асоб. Многія знаходзіліся там па годзе: у выпадку выпіскі іх чакаў угон у Нямеччыну або канцлагер. Таму ачуняўшых перапраўлялі да партызанаў.

Рызыкі пабольшала, калі некаторыя з медыкаў пачалі супрацоўнічаць з лагойскімі падпольшчыкамі. Ужо з канца 1941 года займела сувязь з народнымі мсціўцамі Ганна Захарэвіч: цяпер ёй даводзілася здабываць медыкаменты не толькі для сваіх бальнічных пацыентаў, але і для лясных салдат.

Такой жа смелай і самаахвярнай была і згаданая хірургічная медсястра Марыя Тарайкоўская, муж і брат якой ваявалі на фронце. Пасля напружанага дзяжурства жанчына спяшалася дадому ў недалёкія Цярхавічы, дзе яе чакала малая дачушка. І несла, бывала, лекі для партызанаў, а то і вяла з сабою каго-небудзь з ачуняўшых, каб перапраўць у лес.

Дапамагалі партызанам і Настасся Мытнік, сёстры Ядвіга і Ганна Міклашэўскія, Надзея Мох і іншыя. Вопытным канспіратарам праявіў сябе ваенурач Паўлаў, які стаў галоўным урачом, калі ў Марыі Навумаўны нарадзілася другое дзіця. Перад тым яна падрыхтавала сабе памочніцу — навучыла аперыраваць Яўгенію Бусоль, зусім яшчэ маладую доктарку.

Не абышлося, на жаль, без правалаў і ахвяр. Выдадзены правакатарам, трапіў у рукі гестапаўцаў Аляксей Капылоў, савецкі лётчык, якога, цяжка параненага, вылечылі, паставілі на ногі лагойскія медыкі. Тады разам з ім арыштавалі вялікую групу бальнічных работнікаў. Капылоў мужна перанёс катаванні на допытах, нікога не выдаў, усю віну ўзяў на сябе. Разам з ім загінулі яшчэ чацвёра медработнікаў, аб падпольных сувязях якіх ведаў правакатар: Мытнік, Вершаль, Бабкоўская, Мацкевіч.

Праз некалькі дзён арыштавалі сясцёр Міклашэўскіх. На допыце яны трымаліся мужна, так і не назваўшы тых, хто быў звязаны з партызанамі. Іх расстралялі. Цудам засталася жывой Ганна Захарэвіч. У той дзень акурат яе выклікалі ў вёску Дабрэнева на дапамогу хворай жанчыне. Папярэджаная знаёмым паліцаем, Ганна паспела ўцячы перад тым, як карнікі расправіліся з яе бацькам і сястрой.

Лёс аказаўся літасцівы і да медсястры Алены Капанец. Яе схапілі, калі тая ішла на тайную сходку падпольшчыкаў, змясцілі разам з многімі арыштаванымі ў мураваным доміку пры ўваходзе ў парк. Назаўтра карнікі пачалі выводзіць групамі на расстрэл. У апошні момант, як параіў адзін з арыштаваных, схавалася ў закутак за печкай, так і ўцалела. Болей у бальніцу не прыходзіла, падалася ў партызанскі атрад.

...Калі ў 1970 годзе ў газеце «Комсомольская правда» быў змешчаны дакументальны нарыс Аляксандры Захаранкі з успамінамі былых работнікаў гэтага падпольнага шпіталя, у рэдакцыю пачалі прыходзіць дзясяткі ўдзячных лістоў ад ураваных савецкіх салдат. Вось адно з тых пасланняў: *«Добры дзень, Марыя Навумаўна! Заўсёды помню, што сваім выратаваннем абавязаны вам і ўсім медработнікам Лагойскай бальніцы. Разумею, наколькі няпроста было раздабыць для мяне спачатку даведку як бежанцу з Віцебска, а потым і пашпарт. Пры вашым садзейнічанні мяне прынялі вартаўніком у бальніцу, бо быў патрэбны дакумент, што я працую і адначасова праходжу лячэнне. Інакш мне пагражала адпраўка ў лагер ваеннапалонных».* (З ліста штурмана Дзмітрыя Красільнікава, збітага пад Лагойскам 29 чэрвеня 1941 года).

**Віктар НЕСЦЯРОВІЧ,**
*Лагойск*

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «БПС-Сбербанк»; г. Минск, бульвар им. Мулявина, 6 |

**Предмет аукциона**

| № лота | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20%, бел.руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Здание гаражей,** общ. пл. 120 кв. м, инв. номер 612/С-3842, адрес: Минская обл., Жодино, ул. 40 лет Октября, 15, А | 58 968,00 |
| 2 | **Встроенное помещение,** общ. пл. 326 кв. м, инв. №200/D-87601, адрес: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81 | 110 460,00 |
| 3 | **Административное здание центра банковских услуг №102 ОАО "БПС-Сбербанк",** общ. пл. 249,1 кв. м, инв. №134/С-66, адрес: Брестская обл., Лунинецкий р-н, г. Микашевичи, ул. Черняховского,13. **Земельный участок** общ. пл. 0,0544 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания административного здания. **Обременения:** аренда | 56 404,80 |
| 4 | **Здание гаражей,** общ. пл. 85,5 кв. м, инв. №420/D-1335, адрес: г. Лида, ул. Красноармейская. **Обременения:** частичная аренда 20,5 кв. м | 12 220,80 |
| 5 | **Одноэтажное, кирпичное здание гаража,** общ. пл. 18,7 кв. м, инв. №332/С-49327, адрес: Гомельская обл., Житковичский р-н, г. Житковичи, ул. Фридриха Энгельса, 32А/3. **Земельный участок** общ. пл. 0,0021 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания гаража | 3 995,34 |
| 6 | **Здание закрытой автостоянки,** общ. пл. 313 кв. м, инв. №330/С-11219, адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Ленинская, 2. **Земельный участок** общ. пл. 0,2582 га предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания здания отделения ОАО «Белпромстройбанк» | 58 050,00 |
| 7 | **Здание банка,** общ. пл. 3062, 3 кв. м, инв. №350/С-77314, адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Фрунзе, д. 6. **Земельный участок** общ. пл. 0,2037 га предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания административного здания. **Обременения:** частичная аренда 775,03 кв. м | 3 924 834,00 |
| 8 | **Расчетно-кассовый центр,** общ. пл. 96,9 кв. м, инв. №252/D-35750, адрес: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 185Б. **Обременения:** аренда | 95 888,40 |
| 9 | **Здание гаража,** общ. пл. 58,4 кв. м, инв. №240/С-29480, адрес: Витебская обл., г. Орша, ул. Минская (гараж). **Земельный участок** общ. пл. 0,0084 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания гаража | 15 041,28 |
| 10 | **Торговое помещение,** общ. пл. 197,8 кв. м, инв. №500/D-7102445, адрес: г. Минск, ул. Уманская, 54-49. **Обременения:** аренда | 512 343,60 |
| 11 | **Магазин,** общ. пл. 1176,8 кв. м, инв. №500/С-22967, адрес: г. Минск, ул. Уручская, д. 19Б, корп. 5. **Земельный участок** общ. пл. 7,7627 га предоставлен на праве долевого постоянного пользования (доля в праве 131/625) для реконструкции существующих зданий и сооружений под торговые павильоны и строительство новых зданий, сооружений и торговых павильонов рынка по продаже строительных, электротехнических, сантехнических материалов и оборудования с установленными ограничениями. **Обременения:** частичная аренда 300 кв. м | 2 773 236,00 |
| 12 | **Помещение №10 в подвале административно-торгово-бытового корпуса,** общ. пл. 142,0 кв. м, инв. №500/D-672081, адрес: г. Минск, ул. Мележа, 5/1-10 | 235 626,62 |
| 13 | **Помещение неустановленного назначения,** общ. пл. 171,8 кв. м, инв. №500/D-671247, адрес: г. Минск, ул. Мележа, 5/1-108. | 284 376,96 |
| 14 | **Гараж,** общ. пл. 94,7 кв. м, инв. №100/С-68949, адрес: Брестская обл., г. Брест, ул. Советской Конституции, 4. **Земельный участок** общ. пл. 0,3441га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания банка и здания гаража | 33 998,40 |
| 15 | **Гаражное и складское хозяйство инкассаторской службы,** общ. пл. 396,0 кв. м, инв. №100/С-2860, адрес: Брестская обл., г. Брест, ул. Советской Конституции, д. 4. **Земельный участок** общ. пл. 0,4581 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания гаражного и складского хозяйства инкассаторской службы | 103 831,20 |
| 16 | **Помещение №1,** общ. пл. 173,7 кв. м, инв. №422/D-41170, адрес: Гродненская обл., Щучинский р-н, г. Щучин, ул. Октябрьская, 2-1 | 126 802,80 |
| 17 | **Административное помещение,** общ. пл. 405,1 кв. м, инв. №333/D-26401, адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Советская, 96А-2 | 381 328,80 |
| 18 | **Здание банка,** общ. пл. 1 312,8 кв. м, инв. №612/С-3827, адрес: Минская обл., г. Жодино, ул. Деревянко, д. 3а. **Земельный участок** общ. пл. 0,3208 га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения административного здания банка | 990 075,60 |
| 19 | **Приемный пункт №13,** общ. пл. 256,7 кв. м, инв. №100/С-1753, адрес: Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, д. 88/2. **Земельный участок** общ. пл. 0,1678 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания приемного пункта №13. **Обременения:** аренда | 266 470,80 |
| 20 | **Здание столовой,** общ. пл. 3403,7 кв. м, инв. №350/С-70220, адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. **Земельный участок** общ. пл. 0,1587 га предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания столовой | 2 602 682,40 |
| 21 | **Входная группа «Марокко»,** общ. пл. 2238,8 кв. м, инв. №500/С-55701, адрес: г. Минск, ул. Орловская, д. 80. **Земельный участок** общ. пл. 12,8699 га предоставлен на праве постоянного долевого пользования (доля в праве 27/2000) для строительства и обслуживания. **Обременения: частичная аренда 55,0 кв. м** | 2 773 236,00 |
| 22 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 126,1 кв. м, инв. №500/D-708155171, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-212. **Обременения:** аренда | 292 094,40 |
| 23 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 61,0 кв. м, инв. №500/D-708155172, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-213. **Обременения:** аренда | 174 796,80 |
| 24 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 223,0 кв. м, инв. №500/D-708155175, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-222. **Обременения:** аренда. | 621 517,20 |
| 25 | **Комната переговоров,** общ. пл. 23,1 кв. м, инв. №500/D-708155176, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 16-223. **Обременения:** аренда | 66 193,20 |
| 26 | **Административное помещение,** общ. пл. 222,7 кв. м, инв. №500/D-708155179, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-242. **Обременения: аренда** | 620 680,80 |
| 27 | **Административное помещение,** общ. пл. 23,3 кв. м, инв. №500/D-708155180, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-243. **Обременения:** аренда | 66 766,80 |
| 28 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 226,2 кв. м, инв. №500/D-708155183, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-262. **Обременения:** аренда | 649 141,20 |
| 29 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 23,1 кв. м, инв. №500/D-708155184, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-263. **Обременения:** аренда | 46 258,80 |
| 30 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 286,8 кв. м, инв. №500/D-708155186, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-280 | 682 876,80 |
| 31 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 269,0 кв. м, инв. №500/D-708155174, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-221 | 759 306,00 |
| 32 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 280,6 кв. м, инв. №500/D-708155178, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-241 | 790 334,40 |
| 33-67 | **Машино-место №№228, 231, 232, 234, 247, 241, 242, 244, 245, 246, 249, 254, 255, 257, 261, 262, 263, 265, 266, 269, 271, 272, 277, 278, 279, 229, 233, 235, 236, 240, 248, 253, 256, 260, 264** по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а. Площадь от 12,1 кв. м до 12,2 кв. м. **Обременения** по машино-местам №№228, 231, 232, 234, 242, 244, 245, 246, 249, 254, 263, 265, 271, 272, 277, 278, 279, 248: аренда | 10 776,00 **(за один лот)** |
| 68-71 | **Машино-место №№227,239,250,276** по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а. Площадь от 11,3 кв. м до 13,8 кв. м | 8 872,85 **(за один лот)** |
| 72-73 | **Машино-место №№267,268** по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а. Площадь 14,2 кв. м | 10 273,82 **(за один лот)** |
| 74 | **Машино-место №163,** общ. пл. 12,8 кв. м, инв. №500/D-708039745, по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а-163 | 9 339,84 |
| 75 | **Машино-место №226,** общ. пл. 11,8 кв. м, инв. №500/D-708039756, по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а-226 | 8 639,35 |
| 76 | **Машино-место №252,** общ. пл. 10,0 кв. м, инв. №500/D-708039781, по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а-252. | 7 938,86 |
| 77 | **Машино-место №273,** общ. пл. 10,3 кв. м, инв. №500/D-708039801, по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а-273 | 8 172,36 |
| 78-154 | **Машино-место №№826-845, 848, 849, 852-865, 867-869, 871, 909, 572, 573, 625, 628, 634, 669-676, 678 ,680, 683, 691, 692, 694, 695, 697, 698, 700, 706, 707, 708, 710, 714-718, 720, 724, 725, 727,728** по адресу: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45. Площадь от 10,3 кв. м до 14,5 кв. м | 15 708,44 **(за один лот)** |
| 155-157 | **Машино-место №№846, 847, 866,** по адресу: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45. Площадь от 16,1 кв. м до 18,7 кв. м | 17 198,04 **(за один лот)** |
| 158-162 | **Машино-место №638, 721, 726, 732, 733** по адресу: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45. Площадь от 8,2 кв. м до 10,0 кв. м | 13 948,01 **(за один лот)** |

| № лота | Наименование | Начальная цена без учета НДС |
|---|---|---|
| 163 | **Квартира,** общ. пл. 46,2 кв. м, инв. № 500/D-708141564, число комнат – 1, адрес: г. Минск, ул. Алибегова, 26-17 | 102 430,00 |
| 164 | **Квартира №34,** общ. пл. 137,2 кв. м, инв.№ 420/D-59519, число комнат – 4, адрес: Гродненская обл., г. Лида, б-р князя Гедимина, 10-34 | 139 445,00 |
| **Квартиры, расположенные по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 16** | | |
| 165 | **Квартира №10,** общ. пл. 82,9 кв. м, инв.№500/D-708121002, число комнат – 3. | 217 230,00 |
| 166 | **Квартира №11,** общ. пл. 95,8 кв. м, инв.№500/D-708121003, число комнат – 3. | 235 860,00 |
| 167 | **Квартира №12,** общ. пл. 135,0 кв. м, инв.№500/D-708121004, число комнат – 3. | 306 830,00 |
| 168 | **Квартира №16,** общ. пл. 135,8 кв. м, инв.№500/D-708121008, число комнат – 3. | 308 210,00 |
| 169 | **Квартира №19,** общ. пл. 95,7 кв. м, инв.№500/D-708121011, число комнат – 3. | 246 130,00 |
| 170 | **Квартира №20,** общ. пл. 135,2 кв. м, инв.№500/D-708121012, число комнат – 3. | 321 070,00 |
| 171 | **Квартира №23,** общ. пл. 95,6 кв. м, инв.№500/D-708121015, число комнат – 3. | 245 920,00 |
| 172 | **Квартира №24,** общ. пл. 135,1 кв. м, инв.№500/D-708121016, число комнат – 3. | 321 280,00 |
| 173 | **Квартира №28,** общ. пл. 134,7 кв. м, инв.№500/D-708121020, число комнат – 3. | 320 240,00 |
| 174 | **Квартира №32,** общ. пл. 134,6 кв. м, инв.№500/D-708121024, число комнат – 3. | 319 830,00 |
| 175 | **Квартира №35,** общ. пл. 95,6 кв. м, инв.№500/D-708121027, число комнат – 3. | 245 710,00 |
| 176 | **Квартира №36,** общ. пл. 134,8 кв. м, инв.№500/D-708121028, число комнат – 3. | 320 450,00 |
| 177 | **Квартира №64,** общ. пл. 135,8 кв. м, инв.№500/D-708121056, число комнат – 3. | 351 220,00 |
| 178 | **Квартира №115,** общ. пл. 160,9 кв. м, инв.№500/D-708121107, число комнат – 7. | 376 880,00 |
| 179 | **Квартира №119,** общ. пл. 160,9 кв. м, инв.№500/D-708121111, число комнат – 4. | 376 880,00 |
| 180 | **Квартира №123,** общ. пл. 161,7 кв. м, инв.№500/D-708121115, число комнат – 4. | 384 740,00 |
| 181 | **Квартира №125,** общ. пл. 82,9 кв. м, инв.№500/D-708121117, число комнат – 3. | 223 470,00 |
| 182 | **Квартира №127,** общ. пл. 161,3 кв. м, инв.№500/D-708121119, число комнат – 4. | 384 120,00 |
| 183 | **Квартира №131,** общ. пл. 161,2 кв. м, инв.№500/D-708121123, число комнат – 4. | 383 710,00 |
| 184 | **Квартира №135,** общ. пл. 161,0 кв. м, инв.№500/D-708121127, число комнат – 4. | 383 090,00 |
| 185 | **Квартира №139,** общ. пл. 161,2 кв. м, инв.№500/D-708121131, число комнат – 4. | 383 710,00 |
| 186 | **Квартира №158,** общ. пл. 161,9 кв. м, инв.№500/D-708121150, число комнат – 4. | 404 080,00 |
| 187 | **Квартира №166,** общ. пл. 161,6 кв. м, инв.№500/D-708121158, число комнат – 4. | 403 640,00 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки». Номера счетов в формате IBAN: – в белорусских рублях (BYN): BY60BLBB30120191021390001001; – в евро (EUR): BY33BLBB30120191021390001002; – в долларах США (USD): BY76BLBB30120191021390001004; – в российских рублях (RUB): BY22BLBB30120191021390001006. БИК в формате IBAN: BLBBBY2X

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **21.09.2017 г.** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **19.09.2017 г.** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.(0212) 42-61-62.

**Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка, размер начальной цены и задатка**

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №240100000003009786, площадью 0,0836 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок №3 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена**: 25112,36 руб. **Размер задатка:** 1 000 руб.

Лот №2. Земельный участок с кадастровым №240100000003009783, площадью 0,0827 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок №6 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничений в использовании нет. **Начальная цена**: 24842,02 руб. **Размер задатка:** 1 000 руб.

Лот №3. Земельный участок с кадастровым №240100000003010026, площадью 0,0868 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок №8 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничений в использовании нет. **Начальная цена**: 26073,60 руб. **Размер задатка:** 1 000 руб.

Лот №4. Земельный участок с кадастровым №240100000001013439, площадью 0,0901 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пер.Туловский, №11 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 В. **Начальная цена:** 17721,26 руб. **Размер задатка:** 1 000 руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 20.09.2017 в 9.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 21.08.2017 с 8.30 по 19.09.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY14AKBB36423020002802000000 ф-л №200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. Для участия в аукционе приглашаются граждане и негосударственные юр. лица Республики Беларусь. По заявлению покупателя Витебским горисполкомом может предоставляться рассрочка оплаты земельного участка. **Условия аукциона:** установить сроки выполнения работ по подготовке проектной документации при заключении в установленном порядке договора подряда на выполнение проектных и изыскательских работ, предусмотрев срок выполнения данных работ не более одного года со дня гос. регистрации (по лотам №1,2), принятия решения (по лоту №4); обратиться в установленном порядке за получением разрешительной документации на строительство объекта в отдел архитектуры и градостроительства Витебского городского исполнительного комитета в срок, не превышающий 3 месяца с даты государственной регистрации права на зем. участок (по лоту №3); разработать ПСД в соответствии с действующими техническими ТНПА (по лотам №1,2,4); согласовать ПСД с главным архитектором г. Витебска (по лотам №1,2,4); при необходимости провести гос. экспертизу ПСД (по лотам №1,4); получить в установленном порядке разрешение на строительство объекта, в том числе при необходимости удаления, пересадки объектов растительного мира до начала строительных работ; получить разрешение на проведение компенсационных посадок либо осуществление компенсационных выплат в соответствии с ПСД (по лотам №1,4); в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и одного года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка (по лотам №1,4); в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию земельного участка (по лотам №2,3); осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД(по лотам №1,4), установленные законодательством (по лоту №3)

**Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка**

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221288109601000638, площадью 0,1489 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Сокольники, ул. Луговая, 10Б для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 В. **Начальная цена**: 7382,04 бел. руб. **Размер задатка:** 738,20 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 21.09.2017 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 21.08.2017 с 8.30 по 20.09.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Условия аукциона:** в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией права, ограничений (обременений) права на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY54AKBB36003141101250000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Октябрьский сельсовет)

**Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка**

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №224982808801000023, площадью 0,2478 га по адресу: Витебская обл., Ушачский р-н, Кубличский с/с, д. Рыбаки, ул. Озерная, 7А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Селище), охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 В. **Начальная цена**: 2500 бел. руб. **Размер задатка:** 250 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 21.09.2017 в 11.00 по адресу: Витебская обл., Ушачский р-н, аг. Кубличи, ул. Советская, 1, Кубличский сельский совет. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 21.08.2017 с 8.30 по 20.09.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Условия аукциона:** в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться за гос. регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY54AKBB36003280519350000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Кубличский сельсовет)

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. В аукционе допускается участие консолидированных участников (двух и более граждан, юр. лиц). Для участия в аукционе гражданин, юр. лицо подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, а представители граждан и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо предъявляет доверенности, выданные гражданами, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Условия аукциона: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем.участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка.

**Конт. тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by**

# «А ЯКІЯ ЯШЧЭ ВАРЫЯНТЫ?»


Перавучвацца прыходзяць людзі розных узростаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Потым стала на біржу. Год хадзіла па ўсіх прапановах. Паспела нават на тэлебачанне паспрабавацца.

— На рынку нярэдка такая сітуацыя: або вакансія вісіць для галачкі, бо ўжо ёсць свой чалавек на гэта месца, або тваю працу хочуць выкарыстоўваць за дзве капейкі, — дзеліцца назіраннямі Вольга Сцяпанава. — Я і ў адміністратары ўжо гатова была пайсці. А мне сказалі: «Вы не падыходзіце па гендарнай і ўзроставай прыкметах». Уяўляеце?

— Складана было рашыцца пайсці на курсы?

— Не. А якія ў мяне варыянты? Дапамогу па беспрацоўі я не атрымлівала. Фактычна сядзела на шыі ў мужа. А ў мяне яшчэ дзіця 14-гадовае.

За адной з парт — былы памочнік суддзі. Святлана Багданава, мама дваіх дзяцей, раней працавала ў судзе Цэнтральнага раёна. Расказвае, што ёй падабалася разбіраць грамадзянскія справы.

Да таго як прыйсці на курсы, Святлана разглядала шмат вакансій.

— Хацела ўладкавацца юрыстам у выканкам. А я з дэкрэтнага раней выйшла, яшчэ трох гадоў дзіцяці не было. На папярэднім месцы пытанняў праз гэта не ўзнікала, а тут сказалі, што з маленькім дзіцем не возьмуць, — успамінае жанчына. — Была яшчэ вакансія з заробкам у 360 рублёў. Пасля гутаркі абяцалі ўжо 460, толькі каб прыйшла да іх. Але я не пагадзілася на такі заробак. У мяне 17 гадоў стажу, я юрыдычна добра падкаваная.

У паслужным спісе Святланы Багданавай і спецыяльнасць тэхнолага лёгкай прамысловасці, і праца ў Аб'яднаным інстытуце энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны». Здавалася б, навошта новая прафесія?

— Я сюды ішла матэнакіравана. Паглядзела, на каго можна бясплатна вучыцца, і выбрала курсы лагістаў, бо эканамічная адукацыя ў мяне ёсць: я бухгалтарскія курсы заканчвала. І непадалёк ад майго дома лагістычныя цэнтры знаходзяцца. Заробкі ў гэтай сферы большыя. Менш чым за 800 рублёў працаваць не пайду. Разглядаю варыянты з аплатай ад тысячы і вышэй.

## Работу шукала паўтара года

— Ніколі не думала, што, адвучыўшыся, зноў сяду за парту, — прызнаецца Святлана Шульговіч, псіхолаг па адукацыі.

Дзяўчына працавала ў даведачным цэнтры спецыялістам па тэхнічнай падтрымцы, а паралельна завочна атрымлівала дыплом. «У мяне спецыяльнасць — псіхалогія прадпрымальніцкай дзейнасці. Гэта работа з кадрамі, — тлумачыць Святлана. — Пасля выпуску я вакансіі сабе добрыя нагледзела. Але там бралі людзей або па знаёмстве, або з пяццю гадамі стажу. А ісці кудысьці на мізэрныя заробкі пасля добрага даходу не хацелася».

Святлана шукала работу менавіта па спецыяльнасці. За паўтара года псіхолагу так нічога і не прапанавалі.

— А тут дысцыпліны цікавыя, я іх раней не вывучала, — задаволена курсамі дзяўчына. — Ніякія вакансіі не гляджу пакуль. Атрымаю адукацыю — тады і буду шукаць што-небудзь у гэтай сферы.

— Так, вучыцца вельмі цікава. А вось колькі з нас зможа потым уладкавацца лагістамі — гэта пытанне, — разважае ўголас Валерый Гардзяеня. Ён самы ўзроставы «студэнт» у гэтай групе — мужчыну 55 гадоў. «А ўсюды патрабуюцца 25-гадовыя, са сваёй машынай. Унікумы нейкія!» — уздыхае ён, гартаючы канспект.

Валерый мае адукацыю матэматыка. Але кім толькі ні быў: і майстрам на аўтамабільным заводзе, і інжынерам, і прадпрымальнікам.

— Шмат гадоў захапляўся шахматамі, — працягвае мужчына. — Я кандыдат у майстры спорту, думаў, можа, трэнерам стаць. Жыву ў Чыжоўцы, хацеў там які-небудзь гурток адкрыць. Потым мне знайшлі вакансію. Але там сказалі, што, каб узяць мяне трэнерам, у мяне павінна быць другая вышэйшая адукацыя, фізкультурная ці педагагічная, здаецца.

Прызнаецца: пайсці вучыцца падштурхнуў Дэкрэт №3.

— Альтэрнатыва была запісацца на курсы праграмістаў, але я ўжо не пацягнуў бы. Вы ведаеце, дарэчы, што калі мы кінем курсы без уважлівай прычыны, то мусім вярнуць іх кошт? Тысячу рублёў.

— Куды хочаце ўладкавацца, як адвучыцеся?

— *(Валерый замяўся.)* Мне сказалі, што работу кладаўшчыка лягчэй будзе знайсці... Зноў зарэгіструюся на біржы, а там паглядзім.

## У попыце — спецыялісты шырокага профілю

Перанавучаць беспрацоўных у лагісты ў інстытуце пачалі з лістапада мінулага года. Курсы доўжацца дзевяць месяцаў. Групы набіраюць невялікія — да 20 чалавек. Прымаюць тых беспрацоўных, у якіх ёсць вышэйшая адукацыя (неабавязкова профільная).

Чым займаецца лагіст? Ён размяркоўвае і кантралюе матэрыяльныя і інфармацыйныя патокі. Напрыклад, забяспечвае гандлёвую сетку таварамі, а вытворчае прадпрыемства — рэсурсамі. Самая запатрабаваная — гэта транспартная лагістыка. Для многіх прадпрыемстваў выгадна не самім утрымліваць парк машын, а звяртацца ў лагістычныя структуры, якія дапамогуць ім даставіць матэрыялы найбольш танным і хуткім спосабам.

— Спецыяльнасць карыстаецца попытам. Але сёння ад лагістаў патрабуюць і эканамічныя веды. Таму мы выдаём дыплом з кваліфікацыяй «эканаміст, спецыяліст па лагістыцы», — каментуе **загадчык кафедры эканомікі і кіравання Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў Наталля КАРНЯЛЮК.** — Наймальнік шукае спецыялістаў шырокага профілю. Работнік павінен разумець, як фарміруецца цана, падаткі. Калі гэта дзяржпрадпрыемства — ведаць працэдуру дзяржаўных закупак, якая рэгулюецца вялікай колькасцю нарматыўна-прававых актаў. Спецыяльнасць насычана рознымі прадметамі. Слухачам цяжка, бо многія з іх даўно вучыліся. Але для іх гэта магчымасць уладкавацца на больш высокааплатную работу.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

### ● У тэму

### Якія работнікі запатрабаваны ў сталіцы?

**Сярод рабочых прафесій найбольш неабходныя працаўнікі — на пачатак жніўня ў Мінску налічвалася 345 вакансій. Не хапае муляраў (313 месцаў), маляроў (299) і кухараў (284). У дзясятцы самых запатрабаваных таксама цясляр-бетоншчык, мантажнік будаўнічых канструкцый, прыбіральшчык памяшканняў, тынкоўшчык, кіроўца аўтамабіля.**

**Што да спецыялістаў, то сталіцы катастрафічна не хапае медыцынскіх сясцёр — пустуе 826 месцаў. Высокая патрэба ў інжынерах (539 вакансій) і ўрачах (463). Попытам карыстаюцца праграмісты, фельчары, выхавальнікі, настаўнікі і дырэктары.**

### ● Даведка

**Рэспубліканскі інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў Мінпрацы і сацабароны налічвае больш за 100 відаў навучальных праграм. Ён спецыялізуецца як на павышэнні кваліфікацыі, так і на адукацыі асоб, якія аказаліся ў складаней жыццёвай сітуацыі: беспрацоўных, людзей з інваліднасцю.**

**— Мы распрацоўваем арыгінальныя вучэбныя праграмы і планы, выдаём метадычныя і вучэбныя дапаможнікі. Генерыруем новыя напрамкі ў адукацыі. Так, мы першыя пачалі рыхтаваць беспрацоўных па такіх прафесіях, як адміністратар, кладаўшчык, бухгалтар, тэсціроўшчык праграмнага забеспячэння і іншыя, — адзначае рэктар інстытута Алег ЛІСЕЙЧЫКАЎ. — З гэтай катэгорыяй няпроста. Чалавек, якога звольнілі з работы, пакрыўджаны на ўсіх. Таму нашым выкладчыкам прыходзіцца выступаць і ў ролі педагога, і ў ролі псіхолага. Трэба пераканаць слухача, каб ён паверыў у сябе, — многія ж прыходзяць апусціўшы рукі.**


Валерый Гардзяеня: «Вучыцца цікава. А вось колькі з нас зможа потым уладкавацца лагістамі?»

■ Жніво-2017

# НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ ВЫБІРАЕ ПОЛЕ

**Ёсць жанчыны ў беларускіх вёсках, якія сёлета засядлалі жалезных коней. Дзвюх з іх мы знайшлі ў Ельскім раёне. Дарэчы, надзейнае мужчынскае плячо блізкага сваяка яны таксама адчуваюць побач.**

47 кг асабістай вагі і 19 гадоў — не перашкода для таго, каб асвоіцца на жніве і кіраваць камбайнам. Вераніка Шкала разам з бацькам Валерыем сваю тысячу тон збожжа ўжо намалаціла. Цяпер дажынаюць апошнія гектары ў КСУП «Саўгас «Камуніст». Дзяўчына гаворыць, што тут, на полі, спякотна як у Турцыі, але ж ёй куды лепш побач з бацькам, для якога адпачынак наступіць толькі, калі завершацца ўсе работы ў полі. А ёй, студэнтцы сталічнай ВНУ, цяпер вельмі важна дапамагаць і проста адчуваць падтрымку таты:

— Мы ж цэлы год не бачымся, пакуль я ў Мінску вучуся ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, таму мне вельмі важна пабыць разам з ім. Мы пра рознае гаворым, але ж праца — у першую чаргу. Мае абавязкі — прыйсці раней за бацьку. Там, з боку камбайна, ёсць лючкі, іх адкрываю, чышчу, потым трэба заліць масла, прадзьмуць паветраны фільтр, праверыць, каб чыста ў кабіне было. Гэта не цяжка, калі захацець.

Вераніка здавала на пасведчанне на правы кіравання сельскагаспадарчай машынай яшчэ два гады таму, калі паступала ў ВНУ. І ўжо тады ведала, што будзе працаваць калі-нікалі ў полі. Нягледзячы на тое, што вучыцца дзяўчына на бухгалтара, гаворыць, што ў сям'і ўсе прывучаны да сельскагаспадарчых работ, якія трэба рабіць своечасова і якасна.

— Поле чакаць не будзе. Таму, пакуль ёсць што ўбіраць, выхадных дзён у нас не будзе. Я толькі першыя дні на жніве крыху гублялася. Аднак вакол столькі мужчын. Яны самі прыходзяць на дапамогу, калі трэба.

Валерый Шкала дачкой ганарыцца. Ён сам з самага маленства ў полі. Яшчэ ў школе вучыўся — дапамагаў на «Ніве». Сёння ў іх з дачкой — «КЗС-100» і справа, якая аб'ядноўвае. У гэтай жа гаспадарцы працуе і Яўген Бурміч. Малады кіроўца першым у Ельскім раёне перавёз 1000 тон збожжа. Павіншаваць моладзь, а таксама выказаць падзяку бацькам за добрае выхаванне прыехалі прадстаўнікі БРСМ. Першы сакратар Гомельскага абласнога камітэта Ігар Завалей гаворыць, што сёння на палях вобласці працуе каля 100 маладзёжных экіпажаў, якія займаюцца ўборкай ураджаю:

— Больш за 100 маладых кіроўцаў таксама працуе на адвозе зерня. Мы ў гэты час імкнёмся асабліва падтрымаць маладых механізатараў. Выязджаем на палі, уручаем падарункі, выказваем удзячнасць бацькам. У момант уборачнай патрэбна дапамога сельгаспрадпрыемствам. Не хапае рук для ручной працы, тут школьнікі дапамагаюць. Ім важна зарабіць свой першы рубель і навучыцца працаваць.

У суседняй гаспадарцы КСУП «Скараднянскі» на двух камбайнах — дынастыя механізатараў Яцухнаў. На адным з іх — бацька са старэйшым Віктарам, на другім — сярэдні Максім з самай малодшай Ганнай. Максім убірае збожжа ўжо пяты сезон. Сёлета ўпершыню запрасіў памочнікам сястру. Яна, настаўнік малодшых класаў са светлагорскай школы, адразу ж згадзілася:

— Два месяцы водпуску — занадта многа. Можна за гэты час скарыстацца шанцам і крыху падзарабіць. Чаму б і не? Мы дружныя ў сям'і, дружныя і на працы. Максім усёй механічнай часткай займаецца, а я адказваю за інструменты. Калі патрэбна, магу дапамагчы балты і гайкі круціць. Мне не складана з тэхнікай. Я з дзяцінства марыла атрымаць пасведчанне кіроўцы і атрымала яго. Камбайн — гэта ж машына, няхай і значна большая. Калі нешта не разумею — брат растлумачыць.

Максім гаворыць, што сястра — працаздольны памочнік і яму зручна з ёй:

— Мы добра спрацаваліся. Яшчэ крыху падвучу — і сама будзе руляваць.

Між тым маленькія вучні Ганны пакуль не ведаюць, што іх настаўніца можа не толькі растлумачваць, як прыгожа пісаць літары ці складаць лічбы, але і на «выдатна» спраўляецца з сельскагаспадарчай тэхнікай. Дзяўчына кажа: вернецца да школьнай дошкі — будзе расказваць малым і пра тое, як вырошчваецца ды ўбіраецца беларускі хлеб. Васіль Касенка, дырэктар КСУП «Скараднянскі» лічыць, што сямейныя дынастыі на полі працуюць заўсёды добра:

— Ёсць сярод іх камбайнеры і кіроўцы. У сваякоў паміж сабой больш добразычлівыя ўзаемаадносіны і ўзаемападтрымка.

Згодна з аператыўнымі звесткамі, на Гомельшчыне на гэты час збожжа сабрана з 90% плошчаў. Чакаецца, што да 20 жніўня работы будуць завершаны.


Сямейны экіпаж Ганны і Максіма ЯЦУХНАЎ прызнаны лепшым маладзёжным экіпажам на ўборцы зерневых у Ельскім раёне.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*
■

## Андрэй КУДЗІНЕНКА:

# «Я ЛІЧУ ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ КІНО КРЫХУ АМАРАЛЬНЫМ: БЯРЭШ ЧАЛАВЕКА І ЯГО ЛЁС, А ПОТЫМ У КАСЦЮМЕ ЕДЗЕШ НА ФЕСТЫВАЛЬ»

**Здаецца, яшчэ нядаўна створаны пад куратарствам Андрэя Кудзіненкі кінаальманах «Хранатоп» атрымаў Гран-пры праграмы «Омнібус» на кінафестывалі краін СНД і Балтыі «Кінашок», а сёлета ў арт-вёсцы Каптаруны прайшоў ужо другі форум памежнага кіно «ХРОНОТОПЬ. ART: REBOOT», дзе па распрацаванай рэжысёрам методыцы здымалі фільмы для наступнага кіназбору. Паміж імі — ужо некалькі так званых акцый у розных гарадах краіны і новыя альманахі як вынікі абнулення, пераходу праз стадыю «хронотопи» і абмежаваных у часе здымак. Андрэй Кудзіненка, аўтар фільмаў «Акупацыя. Містэрыі», «Розыгрыш», «Масакра», «Хард Рэбут», прыдумаў канцэпцыю новага кіно і падагнаў пад гэта ідэю сучаснай міфатворчасці, а «Хранатоп» стаў самым арыгінальным, наватарскім і цікавым праектам у сучаснай беларускай кінасферы. Загадкавая «хронотопь» аказалася аўтарскім неалагізмам рэжысёра, і з яе азначэння пачалося нашае інтэрв'ю з Андрэем Кудзіненкам.**

— Гэта час, які патануў у балоце, пераходнае асяроддзе, нейкая памежная зона. Прасцей патлумачыць на казках альбо рытуале ініцыяцыі: тут, каб перайсці ў новую стадыю, чалавек павінен памерці ў адным статусе і нарадзіцца ў іншым. У казках спачатку трэба выпіць мёртвай вады, а потым жывой, герой павінен трапіць у свет з Бабай Ягой і вярнуцца ў рэальнасць. Пераходная стадыя і ёсць «хронотопь», знаходжанне паміж жыццём і смерцю, дзе перамешана сакральнае і несакральнае, сны, незямное, рэальнае і бессвядомае. Гэта хаос, у якім увогуле знаходзіцца наш свет. Антоніа Грамшы казаў пра інтэррэгнум, калі адны цывілізацыі змяняюцца другімі, яшчэ ў 1930-я; Зігмунт Бауман апісаў "цякучую сучаснасць". Зараз усе кажуць пра гібрыднасць — вайна і не вайна, жыццё і не жыццё. Якое жыццё, напрыклад, у нас? — тыповы стан «хронотопи».

> **«Кажучы пра расіян, яны ў свой час выпрацавалі формулу таго, што «піпл хаваюць». Атрымалася замкнутае кола, таму што прывучаны да фаст-фуду глядач ужо не хоча ўскладненняў».**

***— Вы згадваеце ўніверсальныя тэорыі, але ваша азначэнне «хронотопи» адсылае да багны — традыцыйнага элемента беларускай культуры.***

— Я выказваюся з пэўнай самаіроніяй. У маім фільме «Акупацыя. Містэрыі» адзін персанаж кажа, што беларускага кіно ніколі не будзе. Але гэта не сцвярджэнне, а гумар і нейкі дэвіз — кіно будзе, мы ж зараз вось здымаем. «Хронотопь»— таксама рэч аптымістычная, таму што космас нараджаецца з хаосу, а ўсё прыгожае — гэта космас. З сінергетыкі, якую распрацоўваў Ілья Прыгожын (нобелеўскі лаўрэат), вынікае, што кожная маленькая справа нараджае ў хаосе атрактар, з якога пачынаецца структура. Тэорыя хаосу кажа таксама, што ўзмах крылаў матылька недзе ў Бразіліі можа нарадзіць ураган у Невадзе. То-бок любое дзеянне нешта нараджае, у гэтым аптымістычнасць канцэпцыі. Мы пачалі праект «Хранатоп» — я, Аляксандр Дзебалюк, Януш Гаўрылюк і гукарэжысёр Яўген Рагозін — на сваіх пачатках, бо аказаліся ў сітуацыі, калі кіно ўжо няма і можна было толькі пайсці зарабляць на жыццё «прастытуткай» на серыялах, дзе няма ні поля для эксперымента, ні поля для разваг "што такое кіно» і «што такое наша жыццё". Для інтрыгі я прыдумаў, што ў «Хранатопе» мы займаемся актуальнай міфалогіяй. Потым з'явіўся Палупанаў, з якім мы зрабілі некалькі семінараў. Потым з'явіўся Артур (Кліна**ў. — Аўт.**) і сказаў, што трэба ўсіх везці ў Каптаруны. Так жа проста знайшліся грошы на форум, і мы маем дзіўныя вынікі.

***— Чым яны дзіўныя?***

— Тут людзі працуюць дзеля працэсу. Я ўвесь час спрабую зразумець гэта пакаленне Міленіума: для іх працэс важнейшы за вынік. Спачатку праект «Хранатоп» быў альманахам нейкіх людзей. Я ж не казаў, што з усіх навел першага альманаха тры зняў я, чацвёртую даў сябар, а да пятай я напісаў сцэнарый і зрабіў мантаж і гук. Я прынцыпова назваў гэта калектыўным праектам. Так мацней. Мая ідэя была ў тым, каб зрабіць нешта накшталт гурта Laibach альбо дадаізму, то-бок нейкую калектыўную работу, бо зараз, калі няма сродкаў, рабіць кіно можна толькі калектыўна.

***— Усё ж сучасная беларуская міфатворчасць, якой быццам займаецца «Хранатоп», — гэта выдумка альбо рэальная мэта?***

— Можна сказаць, усе мы ствараем міфы. Любое кіно і нават наша размова — міф, а гэта зноў структура, якая ствараецца з хаосу. Беларускі, не беларускі — якая розніца? «Хранатоп» пачынаўся адначасова з падзеямі на Майдане, калі бачна, што нешта адбываецца, і зразумела, што ўсё пойдзе па крузе.

***— Некалькі гадоў таму вы прыдумалі «Хранатоп» з яго асаблівай канцэпцыяй, міфатворчасцю і калектыўнай вытворчасцю, а ваша ўласнае кіно за гэты час не з'явілася. Чаму?***

— Я здымаю сам, але з «Хранатопам» гэта розныя формы творчасці. У пэўны момант я зразумеў, што нашы семінары зайшлі ў тупік, таму што тут сфарміравалася пэўнае кола хранатопаўцаў, якія прыязджаюць з гатовымі камандамі і робяць гісторыі, якія я бачыў ужо тры разы. Тады я спыніўся, сеў, за два месяцы напісаў сцэнарый поўнаметражнай ігравой карціны і пачаў здымаць дакументальны фільм, дзе парушаю ўсе правілы. У свой час я адмовіўся... ужо не памятаю, пасля дзесяці перастаў лічыць, адмовіўся ад серыяльнай вытворчасці, хоць там можна зарабіць добрыя грошы. Проста гэта не цікава, ну навошта? Раптам заўтра памрэш, і што пасля цябе застанецца — серыял «Кадетство» альбо «Опера»? Я належу да старога мадэрністкага пакалення, дзе мастак ёсць мастак. Гэта ў постмадэрністаў ніякага пафасу, усе — мастакі. А як без пафасу ў кіно? Пафас павінен быць. Спачатку працаваць над серыялам мне падабалася: усё ідзе лёгка і па штампе. Але праз два тыдні ўжо нецікава, у любым



месцы, куды я прыходзіў, я думаў «камера тут, потым узбуйненне адсюль і адсюль», то-бок перанёс гэтыя стэрэатыпы ў жыццё. Чым мяне зараз і прываблівае дакументальнае кіно, таму што яно дазваляе ламаць сюжэт, да якога я прывучаны. Я лічу дакументальнае кіно крыху амаральным: бярэш чалавека і яго лёс, а потым у касцюме едзеш на фестываль. Як казаў Кесьлёўскі, «я больш паверу гліцэрынавай слязе ў ігравым кіно, чым сапраўднай у дакументальным». Перад камерай людзі хлусяць. Усе. Так, ёсць момант назірання, але мяне заўсёды засмучаў этычны момант. Але ў выніку я зразумеў, што ў дакументальным кіно таксама ёсць месца паэтычнай манеры, ты пачынаеш працаваць з часам, нарацыяй, жанрамі, робіш некалькі ўзроўняў. Тое ж самае з прасторай: у дакументальным фільме герой ішоў бы ды ішоў, а я пачаў мяняць час праходу. У нейкі момант я разумею, што становіцца нудна, і ўстаўляю кліп, мяшаю будучыню з мінулым, з сённяшнім часам і з іроніяй выходжу з гэтага кліпа. Я атрымаў задавальненне. Фільм называецца «Фанат Вася-пешаход» — пра чалавека, які ходзіць пешшу на ўсе матчы брэсцкага «Дынама», такі беларускі Форэст Гамп. Фільм выйдзе недзе ў кастрычніку.

***— Я думала, вы прыпынілі сваю творчасць дзеля «Хранатопа».***

| Лот №33 | Апартамент №410 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1570. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №34 | Апартамент №411 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1572. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №35 | Апартамент №501 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1564. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №36 | Апартамент №502 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1565. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №37 | Апартамент №503 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1578. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №38 | Апартамент №505 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1593. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 116,7 кв. м | 18 457 171,00 | 1 845 171,10 |
| Лот №40 | Апартамент №509 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1553. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 60,6 кв.м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №41 | Апартамент №510 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1567. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №42 | Апартамент №511 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1571. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №43 | Апартамент №601 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1573. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №44 | Апартамент №602 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1576. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №46 | Апартамент №609 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1587. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №47 | Апартамент №610 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1558. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №48 | Апартамент №611 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1594. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №49 | Апартамент №701 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1595. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207, 60 |
| Лот №50 | Апартамент №702 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1583. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №51 | Апартамент №703 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1566. Назначение – нежилое. Этаж – 7-ой. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №52 | Апартамент №710 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1580. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №53 | Апартамент №711 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1575. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №54 | Апартамент №801 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1574. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №55 | Апартамент №802 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1600. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №56 | Апартамент №803 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1591. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №58 | Апартамент №810 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1610. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №59 | Апартамент №811 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1611. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №60 | Апартамент №901 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1612. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №61 | Апартамент №902 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1638. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №66 | Апартамент №1001 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1659. Назначение – нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 347,7 кв. м | 51 158 074,00 | 5 115 807,40 |
| Лот №67 | Апартамент №1002 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1651. Назначение – нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 344,0 кв. м | 50 614 082,00 | 5 061 408,20 |
| Лот №68 | Апартамент №1003 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1663. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №69 | Апартамент №1004 (2-комнатный 2-уровневый) с кадастровым номером 23:49:0203004:1671. Назначение – нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 139,0 кв. м | 21 983 837,00 | 2 198 383,70 |
| Лот №70 | Апартамент №1009 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1670. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №71 | Апартамент №1010 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1672. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №72 | Апартамент №1011 (4-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1646. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 247,4 кв. м | 36 400 333,00 | 3 640 033,30 |
| Лот №73 | Апартамент №1101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1647. Назначение – нежилое. Этаж – 11. Площадь – 108,3 кв. м | 17 127 889,00 | 1 712 788,90 |
| Лот №74 | Гаражный бокс №1 с кадастровым номером 23:49:0203004:1649. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 14,9 кв. м | 1 344 988,00 | 134 498,80 |
| Лот №75 | Гаражный бокс №2 с кадастровым номером 23:49:0203004:1673. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 14,5 кв. м | 1 342 132,00 | 134 213,20 |
| Лот №80 | Гаражный бокс №7 с кадастровым номером 23:49:0203004:1596. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,2 кв. м | 1 332 137,00 | 133 213,70 |
| Лот №81 | Гаражный бокс №8 с кадастровым номером 23:49:0203004:1601. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,8 кв. м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот №84 | Гаражный бокс №11 с кадастровым номером 23:49:0203004:1607. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,4 кв. м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот №85 | Гаражный бокс №12 с кадастровым номером 23:49:0203004:1598. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 11,3 кв. м | 1 316 432,00 | 131 643,20 |
| Лот №86 | Гаражный бокс №13 с кадастровым номером 23:49:0203004:1604. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 14,9 кв. м | 1 344 988,00 | 134 498,80 |
| Лот №87 | Гаражный бокс №14 с кадастровым номером 23:49:0203004:1605. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,5 кв. м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот №88 | Гаражный бокс №15 с кадастровым номером 23:49:0203004:1608. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 12,5 кв. м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот №89 | Гаражный бокс №16 с кадастровым номером 23:49:0203004:1606. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,1 кв. м | 1 330 710,00 | 133 071,00 |
| Лот №90 | Гаражный бокс №17 с кадастровым номером 23:49:0203004:1614. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 11,7 кв. м | 1 319 287,00 | 131 928,70 |
| Лот №91 | Гаражный бокс №18 с кадастровым номером 23:49:0203004:1609. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,5 кв. м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот №92 | Гаражный бокс №19 с кадастровым номером 23:49:0203004:1617. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 12,1 кв. м | 1 322 143,00 | 132 214,30 |
| Лот №93 | Гаражный бокс №20 с кадастровым номером 23:49:0203004:1562. Назначение – нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 13,0 кв. м | 1 329 282,00 | 132 928,20 |
| Лот №96 | Гаражный бокс №23 с кадастровым номером 23:49:0203004:1653. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 14,3 кв. м | 1 340 704,00 | 134 070,40 |
| Лот №97 | Гаражный бокс №24 с кадастровым номером 23:49:0203004:1676. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 15,9 кв. м | 1 353 554,00 | 135 355,40 |
| Лот №98 | Гаражный бокс №25 с кадастровым номером 23:49:0203004:1655. Назначение – нежилое Этаж – подвал №3. Площадь – 12,4 кв. м | 1 324 998,00 | 132 499,80 |
| Лот №99 | Гаражный бокс №26 с кадастровым номером 23:49:0203004:1656. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 12,8 кв. м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот №102 | Гаражный бокс №29 с кадастровым номером 23:49:0203004:1679. Назначение – нежилое. Этаж – подвал №3. Площадь – 13,7 кв. м | 1 334 993,00 | 133 499,30 |
| Лот №106 | Гаражный бокс №43 с кадастровым номером 23:49:0203004:1667. Назначение – нежилое. Цокольный этаж №2. Площадь – 11,7 кв. м | 1 359 266,00 | 135 926,60 |

### ОПИСАНИЕ АПАРТОТЕЛЯ

Апартаменты и гаражные боксы находятся в здании апартотеля, представляющего собой монолитное 13-этажное здание (введено в эксплуатацию в апреле 2015 г.), расположенного по адресу: г. Сочи, ул. Политехническая, д. 62, в одном из самых экологически чистых районов, на круглосуточно охраняемой территории Государственного учреждения «Санаторий «Беларусь» в непосредственной близости от государственной дачи «Бочаров ручей». Апартотель расположен на земельном участке с кадастровым №23:49:0203004:21 площадью 155 600 кв. м, предоставленном Государственному учреждению «Санаторий «Беларусь» на праве аренды по 22.09.2062. Разрешенное использование земельного участка – для размещения и эксплуатации зданий и сооружений санатория

### УСЛОВИЯ

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по **01.09.2017 г**. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.

Валюта торгов – российский рубль. Валюта платежа — российский рубль.

Задаток за участие в аукционных торгах устанавливается в российских рублях. Сумма для оплаты задатка на участие в аукционе для резидентов Республики Беларусь производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать договор купли-продажи Объекта (Объектов) с Продавцом в течение 5 (пяти) дней с назначенной даты аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты аукциона.

Передача Победителю аукциона (Претенденту на покупку) пакета документов для регистрации (оформления) права собственности осуществляется только после оплаты полной стоимости Объекта (Объектов).

Государственная регистрация договора купли-продажи Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) после полной оплаты стоимости приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) и получения перечисленной суммы Продавцом.

Все расходы по удостоверению, составлению и оформлению договора купли-продажи, уплате государственной пошлины оплачиваются Победителем аукциона (Претендентом на покупку).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Запрет на изменение фасадной части.

Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609, и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 5% от стоимости Объекта (Объектов)

**Аукцион состоится 08.09.2017 г. в 10.00 по мск по адресу: Российская Федерация, Краснодарский край, г. Сочи, ул. Политехническая, 62, конгресс-зал главного корпуса. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а.

Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях BY57BLBB30120190055182001006, BIC банка BLBBBY2X, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002 г. Минск, пр-т Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов (Лот №__), проводимом 8 сентября 2017 г.

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки в соответствии с законодательством Российской Федерации.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются:

- в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – **01.09.2017 до 12.00** по белорусскому времени;
- в г. Сочи, ул. Политехническая, 62, конгресс-зал в здании главного корпуса **07.09.2017 г. с 10.00 до 13.00** по мск. Для этого потенциальному участнику необходимо не позднее **01.09.2017 г**. по средствам электронной почты и (или) факсимильной связи обратиться к Организатору аукциона с заявлением с просьбой о проведении процедуры регистрации в качестве участника аукциона в г. Сочи и представить копию платежного документа о перечислении задатка.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Кришеник Сергей Иванович, тел.: 8-10-7-862-259-60-02 , 8-10-7-862-259-60-12, 8-10-7-928-451-31-69.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# У ПОШУКАХ ЕЖЫ

## Ці здолее чалавецтва пераадолець масавы голад?



**Савет Бяспекі ААН заявіў, што з-за сутыкненняў у Емене, Самалі, поўначы Нігерыі і ў Паўднёвым Судане 20 мільёнаў людзей сутыкнуліся з голадам. У заяве, прынятай пры падтрымцы 15 дзяржаў, выказваецца занепакоенасць у сувязі з тым, што канфлікты ў гэтых чатырох краінах маюць негатыўныя гуманітарныя наступствы для грамадзянскага насельніцтва. На думку намесніка генеральнага сакратара ААН па гуманітарных пытаннях Стывена О'Браена, чалавецтва на парозе гуманітарнага крызісу — свет сутыкнуўся з «найгоршым голадам з 1945 года», які пагражае ў тым ліку каля 2 млн дзяцей. Сёлета «вобласці голаду» ўяўляюць сабой добра прыкметны пояс на карце свету. Адметна, што найбольш жахлівая сітуацыя склалася нават не на тэрыторыі Афрыканскага кантынента, а на поўдні найбагацейшага Аравійскага паўвострава. Чым пагражае масавы голад?**

### Чорны прывід

Голад — насамрэч вечны спадарожнік чалавецва. Гэтая з'ява неадночы згадваецца ў летапісах і нават евангельскіх прароцтвах. Да XIX стагоддзя масавы голад часта ўзнікаў у многіх краінах, быў звязаны з неўраджаем і войнамі. У Сярэднявечны на кожныя 8—10 гадоў выпадаў адзін галодны год з высокай смяротнасцю. Асабліва цяжкія былі 1030—1032 гады ў Францыі, 1280—1282 гады — у Багеміі. Па словах сучаснікаў, падчас голаду 1125-га насельніцтва Германіі зменшылася напалову. Спадарожнікамі гэтай з'явы былі хваробы, мор, рабаванні, забойствы і самагубствы. Справа даходзіла нават да адкрытага пажырання дзяцей бацькамі (як у 1505 годзе ў Венгрыі). Звычайнай і нават узаконенай мераю было выгнанне бедных за гарадскую мяжу, дзе яны былі асуджаны на галодную смерць. У Францыі гэта практыкавалася яшчэ ў XVII стагоддзі. У 1772 годзе ў Саксоніі 150 тысяч чалавек памерлі ад недахвату хлеба. Масавы голад у Заходняй Еўропе сышоў у мінулае з сярэдзіны XIX стагоддзя дзякуючы развіццю сусветнага гандлю і шляхоў зносін, што дазволіла хутка забяспечыць пастаўкі харчавання ў неўраджайныя рэгіёны. Склаўся сусветны рынак харчавання. Цэны на хлеб перасталі наўпрост залежаць ад ураджаю ў краіне.

Але жудасная з'ява не знікла зусім, яна ўзнікае час ад часу ў розных рэгіёнах свету, быццам чорны прывід. Так, за савецкім часам згадваюцца тры вялікія хвалі масавага голаду. У 1921—1922 гадах ён ахапіў 35 губерняў (Паволжа, Паўднёвую Украіну, Крым, Башкірыю, частка Казахстан, Прыўралле і Заходнюю Сібір) з агульным насельніцтвам у 90 мільёнаў чалавек, з якіх галадала не менш за 40 мільёнаў (па афіцыйных савецкіх даных — 28 мільёнаў). Колькасць ахвяр голаду склала каля 5 мільёнаў чалавек. Голад 1932—1933 гадоў лютаваў на тэрыторыі Украіны, Беларусі, Паўночнага Каўказа, Паволжа, Паўднёвага Урала, Заходняй Сібіры, Казахстана, што пацягнула значныя чалавечыя ахвяры (па розных ацэнках ад 2 да 8 мільёнаў чалавек). У 1946—1947 гадах адзначаны трэці масавы голад савецкага перыяду. У выніку загінула, па розных ацэнках, ад 200 тысяч да 1,5 мільёна чалавек.

Шэраг афрыканскіх краін перажывалі масавы голад у 1968—1973 гадах. Так, у выніку недахвату харчавання, выкліканага засухай, у Нігеры памерла 100 тысяч чалавек. У аглядзе стыхійных бедстваў Нацыянальнага геаграфічнага таварыства ў 1978 годзе доктар Дрэйсбек пісаў з Нігера: «Я бачыў тысячы трупаў свойскіх жывёл... Качэўнікі, якія калісьці імі валодалі, знаходзяцца ў лагерах выратавання і атрымлівалі ежу, дасланую з усяго свету. Мы бачылі людзей, якія пакутавалі ад недаядання і хвароб. Пры такім саслабелым здароўі многія паміралі ад пнеўманіі, адру і коклюшу. Падобных наступстваў голаду я амаль не сустракаў. Нігер размешчаны ў зоне Сахеля Афрыкі, з'яўляецца самым засушлівым месцам у свеце. Калі не выпадаюць даждыы, тут па-ранейшаму паміраюць людзі, перасыхаюць рэкі, гіне ўраджай». Ад маштабнага масавага голаду ва Усходняй Афрыцы ў 2011 годзе памерлі ад 50 да 100 тысяч чалавек, на поўдзень ад Сахары і цяпер недаядае кожны чацвёрты. У другой палове 1990-х гадоў Паўночная Карэя з-за маштабных паводак перажыла масавы голад сярод насельніцтва, які каштаваў сотні тысяч жыццяў. Пастаўкі ежы тут у пэўнай меры стабілізаваліся толькі ў пачатку 2000-х гадоў.

У глабальным кантэксце, нягледзячы на значныя дасягненні ў скарачэнні хранічнага голаду ў 1980-я і ў першай палове 1990-х, прагрэс па зніжэнні колькасці галадаючых запаволіўся ў перыяд з 2000 па 2010 год. Як правіла, такая небяспека існуе ў самых бедных краінах і рэгіёнах свету, якія сталі арэнай унутраных і знешніх канфліктаў. Аднак колькасць такіх рэгіёнаў у апошнія гады, на жаль, павялічваецца, прычым насельніцтва там расце, што яшчэ больш пагаршае сітуацыю. Гэтыя тэрыторыі і ў XXI стагоддзі жывуць, падпарадкоўваючыся прыродным цыклам — засуха для многіх азначае галодную смерць.



### Каталізатар рэвалюцый

Аналітыкі дасканала вывучылі глабальную з'яву і вынеслі свой вердыкт. Стывен Дзевер, аўтар шматлікіх даследаванняў аб прычынах яе ўзнікнення, у 2000 годзе апублікаваў кнігу «Голад у XX стагоддзі», у якой асаблівая ўвага ўдзяляецца сітуацыі ў Афрыцы. На яго думку, у гэтым рэгіёне свету галоўнай прычынай голаду з'яўляюцца ўзброеныя канфлікты, якія знішчаюць сельскую гаспадарку і прыводзяць да хаосу ў сістэмах дастаўкі харчавання. Дзевер рэзюмуе, што «голад узнікае толькі таму, што яго ніхто не паспрабаваў прадухіліць». Брытанскі афрыканіст Алекс дэ Ваал, аўтар шматлікіх кніг пра голад у Афрыцы, у апошняй з іх «Голад, які забівае: Дарфур, Судан» сцвярджае, што «любы ўрад, калі таго жадае, можа прыняць эфектыўныя меры, здольныя спыніць голад». Ён адзначае, што Афрыка валодае значным патэнцыялам у галіне сельскай гаспадаркі і, такім чынам, няма падстаў, каб кантынент адчуваў дэфіцыт з харчаваннем.

Майк Дэвіс у кнізе «Халакост Віктарыянскай эпохі» апісвае трагічную сітуацыю, якая склалася ў многіх рэгіёнах свету напрыканцы XIX стагоддзя. Тады голад узнік у многіх рэгіёнах Індыі, Кітая, Бразіліі і Афрыкі, смяротнасць была неверагодна высокай — дарогі былі літаральна пакрытыя целамі памерлых. Голад выклікаў масавыя хвалі міграцыі насельніцтва, прывёў да рабаванняў, забойстваў і гвалту, узнікнення эпідэмій. Дэвіс падкрэслівае, што ў шматлікіх выпадках улады неадэкватна і вельмі цынічна рэагавалі на гэтую катастрофу. Напрыклад, у тыя гады аб'ёмы вывазу пшаніцы з Індыі ў Еўропу пабілі ўсе рэкорды, хоць мільёны індусаў паміралі ад недахвату харчавання. Улады і гандляры збожжам тлумачылі свае дзеянні законамі свабоднага гандлю, паколькі еўрапейцы маглі заплаціць за хлеб больш, чым індыйцы. Дэвіс лічыць, што падобныя дзеянні ўладаў могуць лічыцца актам генацыду.

Аўтары акадэмічнага зборніка «Дэмаграфія голаду» адзначаюць, што ў часы масавага голаду звычайна гіне больш мужчын, чым жанчын, а прычына большасці смерцяў не ўласна голад, а непазбежна спадарожныя яму хваробы. Існуюць і іншыя наступствы. Так, напрыклад, рэзка павялічваецца колькасць самагубстваў, скарачаецца ўзровень нараджальнасці (пасля заканчэння голаду звычайна назіраецца кароткатэрміновы ўсплёск нараджальнасці, які зноў ператвараецца ў спад) і памяншаецца колькасць шлюбаў. Масавы голад прыводзіць да сур'ёзнай змены дэмаграфічнай структуры насельніцтва: у прыватнасці, рэзка памяншаецца доля дзяцей і старых і павялічваецца доля жанчын.

«Голад — вось што робіць людзей рэвалюцыянерамі. Свой ці чужы. Але калі яго адчуваюць, як свой», — сказаў некалі легендарны лацінаамерыканскі рэвалюцыянер Эрнеста Чэ Гевара. Як адзначае харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН (FAO), цяпер ёсць «дастатковыя рэсурсы для задавальнення харчовых патрэб свету», аднак «працягваюць існаваць цяжкасці эканамічнага, сацыяльнага і палітычнага характару, якія перашкаджаюць задавальненню гэтых патрэб». Па сцвярджэнні FAO, кожны сёмы чалавек у свеце пакутуе ад хранічнага голаду і недаядання.

Штодня ад голаду ў свеце паміраюць каля 25 тысяч чалавек. Сярод тэрыторый з максімальнай смяротнасцю ад голаду — краіны з высокай шчыльнасцю насельніцтва, недахватам прыродных рэсурсаў (перш за ўсё вады), рэлігійнымі забаронамі на рэгуляванне нараджальнасці. У найгоршым стане жыхары краін, дзе ўсе гэтыя фактары прадстаўлены адначасова (напрыклад, Эфіопія). Прадстаўленне харчовай дапамогі — толькі адтэрміноўка: ні вады, ні ўрадлівай зямлі для тых, якія зноў нарадзіліся, няма, і сітуацыя з кожным годам пагаршаецца.

### На чым трымаецца харчовая бяспека?

Брытанскі аналітычны цэнтр Chatham House выявіў 14 геаграфічных кропак і аб'ектаў інфраструктуры, на якіх трымаецца сусветная харчовая бяспека, піша выданне El Pais. Сярод іх — Панамскі і Суэцкі каналы, Басфор і Дарданелы, Гібралтарскі праліў, парты на берагах Чорнага мора і чыгункі прычарнаморскага рэгіёна. Даследчыкі перасцерагаюць: ні ўрады, ні міжнародныя арганізацыі не надаюць належнай увагі праблемам, якімі багатыя крызісы ў адпаведных кропках. Напрыклад, калі перакрыць праліvы Басфор і Дарданелы, гэта можа справакаваць дэфіцыт харчавання ў Паўночнай Афрыцы. Тлумачыцца ўсё проста — праз гэтыя пралівы перапраўляецца пятая частка сусветнага экспарту пшаніцы — партыі, якія адгружаюцца з Расіі, Украіны і іншых краін Прычарнамор'я і накіроўваюцца ў Паўночную Афрыку, а таксама на Блізкі Усход. Альтэрнатыўных маршрутаў або спосабаў даставіць пшаніцу ў рэгіёны-атрымальнікі практычна няма.

Па інфармацыі El Pais, 60% калорый, спажываемых чалавецтвам, прыпадаюць на кукурузу, пшаніцу і рыс. Гэтымі прадуктамі сілкуюцца 2,8 млрд чалавек. «Таму праблемы, якія могуць ударыць па асноўных вузлах імпарту і экспарту гэтых прадуктаў, ствараюць сур'ёзную рызыку для харчовай бяспекі многіх краін», — піша выданне. «Гэта не такія прыкметныя рызыкі, пра іх думаюць недастаткова, каб падрыхтавацца», — прызнае галоўны эканаміст FAO Абдольрэза Абасіан. У дакладзе Chatham House гаворыцца аб кліматычных зменах, якія могуць выклікаць неўраджай на глебе засухі ці паводак, а таксама справакаваць збоі ў пастаўках. Дапусцім, ураган перашкодзіць экспарту пшаніцы з ЗША, а паводкі ў Бразіліі перашкодзяць дастаўцы соі ў парты. «Ёсць таксама рызыка, што гэтыя «бутэлечныя рыльцы» будуць перакрытыя з прычыны канфліктаў, войнаў ці сутыкненняў», — піша El Pais.

У дакладзе прапанаваны канкрэтныя меры: зрабіць запасы харчавання на выпадак надзвычайных сітуацый, заключыць палітычныя пагадненні, інвеставаць у мадэрнізацыю інфраструктуры. «Не варта ўпадаць у панікёрства», — мяркуе Абасіан, падкрэсліваючы, што ў дакладзе ідзе гаворка аб патэнцыйных рызыках і праблемах. І ўсё ж выданне адзначае: «Рост насельніцтва і змены рацыёну азначаюць, што ўсё больш краін упадае ў залежнасць ад імпарту харчавання».

Паводле ацэнак Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, да канца стагоддзя на планеце будуць пражываць 11,2 млрд чалавек. Зараз гэты паказчык складае 7,5 млрд. Генеральны дырэктар Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН Жазэ Грацыяну да Сілва папярэджвае, што чалавецтва ўжо перавысіла межы магчымасцяў нашай планеты, таму неабходна тэрмінова змяніць сваё стаўленне да навакольнага асяроддзя. Рост насельніцтва адбываецца ў самы нязручны час. Каб перамагчы глабальнае пацяпленне, чалавецтву трэба аддаваць усё больш пасяўных плошчаў для вырошчвання сыравіны для біяпаліва. Пры гэтым высякаць лясы пад новыя сельгаспалеткі таксама нельга: планета і так задыхаецца ад парніковых газаў, іх выкіды летась пабілі ўсе рэкорды.

Таму навукоўцаў сур'ёзна хвалюе пытанне: чым насельніцтва Зямлі будзе харчавацца ў наступным дзесяцігоддзі? На першы погляд адказ відавочны — каб пракарміць жыхароў, аграрыям трэба проста павялічваць прадукцыйнасць. Тым больш ураджайнасць і так пастаянна павышаецца дзякуючы з'яўленню новых сінтэтычных угнаенняў. Але не ўсё так проста. Каб у свеце не было недахвату ежы, вытворчасць збожжавых павінна падвоіцца. 40 гадоў для гэтага будзе недастаткова, палічылі даследчыкі з універсітэта Мінесоты. Ураджайнасць расце занадта павольна. Нават там, дзе на службу сельгасвытворцам пастаўлены ўсе дасягненні навукі, павысіць прадукцыйнасць больш за пэўны ўзровень не атрымаецца. Вытворцы ўпіраюцца ў «біялагічную сцяну» — немагчымасць вырошчваць на адным участку больш вызначанай колькасці прадукцыі. Ці азначае гэта, што ў будучыні свет безальтэрнатыўна сутыкнецца з маштабным голадам? Зусім не. Каб ежы хапала ўсім жыхарам Зямлі, лічаць эксперты, чалавецтву трэба вырашыць некалькі глабальных праблем. Па-першае, адмовіцца ад вытворчасці біяпаліва. Павысіць ураджайнасць, дзе гэта магчыма, удасканальваць угнаенні. Паменшыць колькасць мяса ў рацыёне людзей, а таксама скараціць колькасць харчовых адходаў ва ўсім свеце. Комплекс задач, як бачым, унушальны, справіцца з ім будзе няпроста, аднак і вынік таго варты.



**Захар БУРАК.**
burak@zviazda.by

## Вячаслаў ХАРАНЕКА:

# «ПАСЛЯ ТРАГЕДЫІ Ў МЕТРО Я СТАЎ ВАСТРЭЙ АДЧУВАЦЬ ЖЫЦЦЁ»,

## або Чатыры правілы жыцця ад аднаго з самых моцных людзей краіны

**Каб пералічыць усе яго дасягненні, не хопіць газетнай паласы, а калі коратка — Вячаслаў ХАРАНЕКА ўстанавіў 150 рэкордаў у экстрэмальным пад'ёме цяжараў, 6 з іх занесены ў Кнігу Гінеса, 130 — у кнігу рэкордаў Расіі, СНД і Балтыі «Дзіва». Ён паднімаў гіры, гантэлі, штангі і піўныя бочкі, ён рабіў гэта стоячы, лежачы, седзячы, куляючыся, у шпагаце на сушы і пад вадой. Яго рэкорды доўжыліся ад адной хвіліны да двух сутак, а цяжары, якія ён паднімаў, важылі ад 16 да 150 кг. Сёння Вячаславу 56 гадоў, ён перанёс некалькі аперацый, але ў яго планах яшчэ ёсць рэкорды. Як ён перажыў тэракт у мінскім метро, чаму здымаецца ў кіно і якімі прынцыпамі кіруецца ў жыцці, Вячаслаў Харанека расказаў у інтэрв'ю «Звяздзе».**



***— Вячаслаў, вы пачалі ўстанаўліваць рэкорды з 1991 года, сочыце за іх лёсам?***

— Рэкардсменам, як і алімпійскім чэмпіёнам, застаешся на ўсё жыццё, гэта званне не пераходзіць, нават калі рэкорд ужо пабіты. Дакладна ведаю, што пяць маіх дасягненняў не пабіты да гэтага часу, а наогул іх асноўная частка прыпала на перыяд з 2013 па 2015 год.

***— Што трэба для таго, каб рэкорд быў зарэгістраваны?***

— Каб трапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса, перш за ўсё, трэба быць у чымсьці неспасціжным чалавекам. Потым падаць заяўку ў гэтую арганізацыю, запрасіць камісара, такая працэдура каштуе немалых грошай — прыкладна ад пяці тысяч еўра. Калі ты ўстанаўліваеш рэкорд, неабходна, каб здымкі вяліся з трох камер: спераду, збоку і ззаду. Акрамя камісара і суддзяў на мерапрыемстве павінна быць пэўная колькасць вядомых людзей, плюс фатографы і прэса. Толькі пры гэтых умовах заяўка будзе разгледжана.



***— Які з сваіх рэкордаў вы памятаеце больш за ўсё?***

— Памятаю абсалютна ўсе, як маці памятае сваіх дзяцей. Асабліва — самы доўгі, які працягваўся двое сутак, ён быў самы складаны. Гіру ў 42 кг я падняў больш за шэсць тысяч разоў. Люблю прымяркоўваць свае дасягненні да памятных дат, тады быў 60-гадовы юбілей Дня Перамогі, для мяне гэта вельмі сур'ёзнае свята. Туды, дзе я ўстанаўліваў рэкорд, прыехаў міністр унутраных спраў краіны (тады гэта быў Уладзімір Навумаў) і датэрмінова даў мне званне падпалкоўніка.

***— Падчас гэтага рэкорду двое сутак вы былі без сну?***

— У канцы кожнай гадзіны па правілах дазвалялася адпачыць — пяць хвілін днём і дзесяць ночу. У гэты час можна было зрабіць масаж, паесці, схадзіць у туалет. Гэта і сёння самы працяглы сілавы рэкорд у свеце. Я пачаў рыхтавацца да яго за паўгода, усё вельмі старанна прадумваў, распрацаваў сістэму харчавання. Пры гэтым прысутнічалі тры судзейскія брыгады, якія пастаянна мяняліся і спалі, увесь час стаяў толькі я.

***— Наколькі я ведаю, рэкорды Гінеса не прыносяць фінансавых прыбыткаў.***

— Так. Гэта прэстыжна для краіны, але за іх не плацяць грошы і не даюць кватэры, як, напрыклад, за алімпійскі медаль. Калі б у мяне на першым месцы стаяла фінансавае пытанне, я б ужо даўно скончыў, суцешыў свае амбіцыі і завяршыў спартыўную кар'еру. Хтосьці сказаў: грошы — гэта талоны на жыццё, але яны далёка не заўсёды з'яўляюцца талонамі на шчасце.

**«Дзякую Богу за добрае, а калі здараецца нешта дрэннае, па-філасофску імкнуся ставіцца да гэтага».**

Лічу, што вельмі важна знайсці сябе ў сферы, дзе ты будзеш адным з найлепшых. Я заўсёды хацеў быць моцным, у дзяцінстве вельмі хацелася падабацца дзяўчатам. Некалькі гадоў займаўся штангай, выканаў кандыдата ў майстры спорту, але ў гэтым відзе спорту, як і ўсюды, павінен быць талент, добрая выбуховая сіла, магутныя ногі. Гэтага не было. А вось у гіравым спорце ўсё атрымалася: у мяне добрая вынослівасць, уменне трываць. У спорце дасягнуў усіх званняў і пачаў прыдумваць трукі.

А калі вяртацца да фінансавага пытання, то я ж працаваў выкладчыкам у Акадэміі МУС, гэта і быў мой даход. Як ваенны пайшоў на пенсію ў 45 гадоў, калі сёння пытаюцца, чаму працягваю працаваць, заўсёды кажу: пенсія добрая, але маленькая.

***— Мяркуючы па ўсім, увагу вы любіце і цяпер, калісьці вас можна было ўбачыць і на тэлебачанні.***

— Удзельнічаў у праектах «Бітва гарадоў» і «Бітва тытанаў». Чаго там толькі не было, лёс садзіў нават у бочку з быком. Разам з Кірылам Шымко на СТБ вялі праграму ў рамках «Добрай раніцы» і рабілі гэта цалкам бясплатна, хоць у гэта ніхто ніколі не верыў. Пяць гадоў адпрацаваў у часопісе «Спецназ», вёў рубрыку прыёмаў абароны. А неяк у маім жыцці з'явіўся адзін з самых цікавых праектаў — «Зорны цырк». На працягу чатырох месяцаў кожны тыдзень мы паказвалі гледачам новыя вобразы. Мяне навучылі лётаць пад купалам цырка (хоць я вельмі баюся вышыні), жангліраваць, выдатна ладзіць з жывёламі. Якраз пасля нумара з дрэсіроўкай ламы запрасілі здымацца ў кіно.

***— І там вы таксама знайшлі сябе?***

— Мне гэта падабаецца, кіно пакінула цікавы след у маім жыцці. Сыграў у дзесяці фільмах, гэта ў асноўным расійскія і айчынныя серыялы. У 2008 годзе сыграў эпізадычную ролю ў серыяле «Захопнікі», у мяне там станоўчы вобраз камандзіра атрада спецназа «Тыгр», я лавіў бандытаў. Іграў у рабоце нашага вядомага рэжысёра Аляксандра Яфрэмава ў фільме «Замах». Быў маёрам сувязі, у мяне там кароценькая роля, але я ёю вельмі ганаруся.

***— У адмоўных персанажах рэжысёры вас не бачылі?***

— Якраз адна з крайніх роляў была ў серыяле «Вяртанне Мухтара-2». Я там у ролі злодзея-рэцыдывіста ва ўцёках. Не ведаю, ці ўдалася яна мне, прыяцель сказаў, што вочы выдаюць маю дабрыню. Увогуле, мой духоўны настаўнік у кіно Генадзь Якаўлевіч Чацверыкоў казаў: «Слава, любыя ролі трэба іграць». Праўда, няма маленькіх роляў, ёсць маленькія акцёры. Нават калі б мне прапанавалі сыграць слуп, я б пагадзіўся.

***— З чым звязаны самы складаны момант у вашым жыцці?***

— Ён быў не адзін. Першы — яшчэ ў маладым узросце ў пачатку 90-х. На гульнявой трэніроўцы атрымаў пералом нагі са зрушэннем, мінімум 3—4 месяцы трэба было аднаўляцца, а праз тры тыдні праходзіў чэмпіянат СССР. Было настолькі крыўдна, што ўпершыню пачалі наведваць думкі пра тое, каб завяршыць кар'еру. Першыя тры дні выжымаў гіру лежачы, потым стоячы на касцылі, але ў рэшце рэшт выступіў на гэтым турніры.

Другі момант аказаўся ўжо больш сур'ёзным. Я трапіў у тэракт у мінскім метро ў 2011 годзе. Як цяпер памятаю 11 красавіка, на памяць застаўся шрам на галаве, але не асабліва люблю пра гэта расказваць. Некаторыя тады казалі, што выбух — піяр для Харанекі, на самай справе яго там не было. Я апынуўся ў метро выпадкова, у пераходзе з Кастрычніцкай на Купалаўскую чакаў чалавека. Аскепак мармуру рассек галаву. Тады доўга не мог апамятацца, усвядоміць, што адбылося. Увечары таго дня, калі з бальніцы адпусцілі дадому, выпіў бутэльку каньяку і нават не ап'янеў. Тады таксама пачалі наведваць думкі, што самы час заканчваць са спортам, аднак, калі Бог дае мне жыць, значыць, шлях яшчэ не скончаны.

***— Як гэтая трагедыя змяніла вас?***

— Я стаў больш востра адчуваць жыццё. Калі раней, груба кажучы, цаніў кожную хвіліну, то цяпер я цаню кожную секунду. На дробязі стараюся не звяртаць увагі, гэта такая мітусня. Самае галоўнае ў жыцці чалавека — само жыццё, здароўе, якое не купіш ні за якія грошы.

***— Нядаўна вы перанеслі дзве складаныя аперацыі...***

— Пачаліся праблемы з тазасцегнавымі суставамі, вядома, да гэтага падштурхнуў спорт. Усё, што звязана са звышнагрузкамі, нервовымі або фізічнымі, ніколі не прыносіць здароўя. Апошнія некалькі рэкордаў я рабіў ужо на абязбольвальных — цалкам сцерліся храсткі. Цяжка было нават хадзіць. Калі доўга прымаў таблеткі, з'явілася язва страўніка, трываць было ўжо немагчыма, толькі тады звярнуўся да дактароў. Нашы вельмі добрыя спецыялісты зрабілі найскладанейшыя аперацыі выдатна. І, ведаеце, пасля гэтых праблем я не збіраюся спыняцца. Цяпер выжымаю гіру лежачы (стоячы нельга), і ў верасні, з 14 па 17, калі ў Віцебску будзе праходзіць Кубак губернатара і 3-я Сусветная алімпіяда па гіравым спорце, паспрабую ўстанавіць чарговы рэкорд. Усіх сакрэтаў пакуль раскрываць не буду, але для мяне гэта будзе маленькі спартыўны подзвіг.

***— На колькі гадоў вы сябе адчуваеце?***

— Мне цяпер 56, а людзі звычайна даюць 40—45. Сам я адчуваю сябе на гадоў 35, а па эмацыянальным стане наогул яшчэ юнак *(смяецца)*.

***— Назавіце некалькі прынцыпаў, якіх вы прытрымліваецеся?***

— Я чалавек веруючы, хаджу ў царкву, люблю, калі там мала народу, гэта дае магчымасць пабыць з думкай, падзякаваць, успомніць родных, якіх ужо няма са мной. Дзякую Богу за добрае, а калі здараецца нешта дрэннае, па-філасофску імкнуся ставіцца да гэтага. Ёсць чатыры правілы, якіх я прытрымліваюся: ставіцца да людзей так, як хацеў бы, каб ставіліся да цябе; не ствараць сабе куміра; імкнуцца па магчымасці менш хлусіць і не судзіць іншых. Чалавек сам па сабе слабы, у нас ёсць эгаістычнае і карыслівае, але гэта трэба ў сабе заглушаць.

**«Апошнія некалькі рэкордаў я рабіў ужо на абязбольвальных».**

***— З кім з вядомых людзей вы хацелі б пазнаёміцца?***

— Іх шмат. Калі браць спорт, то гэта сусветны рэкардсмен Юрый Уласаў. Мне хацелася б пагутарыць з першым прэзідэнтам ЗША Джорджам Вашынгтонам, думаю, знайшоў бы, што ў яго спытаць, мне здаецца, ён вельмі цікавы чалавек. Люблю кнігі і паэзію, таму марыў бы пазнаёміцца з Амарам Хаямам, мы б знайшлі агульную мову, таму што ён таксама любіў жыццё, пісаў пра каханне, пра жанчын. Ну і, мабыць, Казанова, ён увайшоў у гісторыю як спакуснік, лавелас, але быў найразумнейшы чалавек. Ведаў некалькі моў, быў бізнесменам, прыдумаў латарэю ў Францыі.

***— Які фільм вы лічыце найлепшым?***

— Па жанры мне бліжэй за ўсё камедыі, бо чалавека расстроіць — раз плюнуць, а вось рассмяшыць... Люблю «Джэнтльменаў удачы», «Іван Васільевіч мяняе прафесію», «Брыльянтавую руку» і гэтак далей. Што не тэкст, то афарызмы, ды і вельмі жыццёвыя.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.

**Адзін з рэкордаў шматразовы чэмпіён свету па гіравым спорце і рэкардсмен Кнігі рэкордаў Гінеса ўстанавіў у Камандна-інжынерным інстытуце МНС. На працягу гадзіны ён выжаў 1410 разоў 24-кілаграмовую гіру са становішча лежачы адной рукой. Папярэдні рэкорд у гэтым практыкаванні складаў 1200 разоў.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ № 1.**<br>Автомобиль «МАЗ 5337А2 КС-45729А-4», 2008 г. в., гос. номер АЕ6310-2, **начальная стоимость лота** 30 761,04 **(тридцать тысяч семьсот шестьдесят один) белорусский рубль 04 (четыре копейки)**.<br>**ЛОТ № 2.**<br>Автомобиль «МАЗ 6303А3 КС-55727-7», 2009 г. в., гос. номер АІ2785-2, **начальная стоимость лота** 42 313,92 **(сорок две тысячи триста тринадцать) белорусских рублей 92 (девяносто две копейки)** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Стройкомплекс» (г. Витебск, ул. Суражская 6-я, д. 9, УНП 300047772) |
| **Местонахождение имущества** | г. Витебск, ул. Суражская 6-я, д.9.<br>По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ОАО «Стройкомплекс» Пчелкину Виктору Евгеньевичу (раб. тел. 0212-43-26-01). |
| **Наличие обременений** | Не имеет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.4<br>31 августа 2017 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.4<br>Судебный исполнитель – Деревнин Сергей Евгеньевич, тел.: (0212) 61 40 08, т. м. 375-33-687-91-44.<br>Начальник отдела – Бураков Игорь Вячеславович тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома BY73AKBB36429030010372000000, AKBBBY21200 филиала №200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 17.00 часов 30 августа 2017 г.<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии со ст. 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62

**Продавец:** Лиозненское районное потребительское общество, г. п. Лиозно, ул. Ленина, 82, тел. (02138) 4-12-07

Лот №1. Капитальное строение с инв. №202/С-76449 площадью 1027,8 кв. м, наименование: здание склада, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, по адресу: Витебская обл., Лиозненский р-н, г. п. Лиозно, ул. Добромыслянская, д. 28А, на зем. участке №223055100001002438 площадью 1,0143 га. **Нач. цена:** 36 951 руб. с НДС. **Задаток:** 3 695,10 руб. **Шаг аукциона:** 1 847,55 руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 22.09.2017 в 11.00 по адресу: г. п. Лиозно, ул. Ленина, 82 в Лиозненском районном потребительском обществе. Срок внесения задатка и подачи документов: с 22.08.2017 с 8.30 по 21.09.2017 до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: возместить затраты по оценке имущества, оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, указанные в договоре купли-продажи. Ранее опубликованные извещения: газеты «Звязда» 16.05.2017, 29.06.2017, «Сцяг перамогі» 16.05.2017, 05.07.2017, «Витебские вести» 16.05.2017, 01.07.2017

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением правления Витебского облпотребсоюза от 20.09.2011 №301. Для участия в аукционе представляются документы: заявление на участие в аукционе, заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка, копия документа, подтверждающего гос. регистрацию (для юр. лица, индивидуального предпринимателя); копии учредительных документов (для юр. лица); легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (не ранее чем за 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык (для юр. лиц – нерезидентов РБ), заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. При подаче документов физ. лицо, представитель физ. лица и юр. лица предъявляет документ, удостоверяющий личность, документ подтверждающий полномочия лица на представление интересов. Осмотр предметов торгов осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. по месту нахождения имущества. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Задаток перечисляется на **р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**. Организатор аукциона вправе не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информация по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

### РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 30 августа 2017 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 50% после вторых несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости, принадлежащих открытому акционерному обществу «Гомельдрев» на праве собственности

| Наименование объекта | Адрес объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т. ч. НДС 20%) | Задаток, руб. (в т. ч. НДС 20%) |
|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | | | | |
| Овощехранилище, **инв. №340/С-294758** | Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, 5 | Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Одноэтажное кирпичное здание, 1999 года постройки. Общая площадь 77,3 м кв. | **109 680,00** | **10 000,00** |
| Столовая, **инв. №340/С-290646** | Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, 4а | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное деревянное здание, 1968 года постройки. Общая площадь 146,0 м кв. | | |
| ***Земельный участок*** *на праве постоянного пользования площадью* ***0,3707 га*** *с кадастровым номером 324500000001009417.* ***Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, площадь 0,3707 га*** | | | | |
| Цех СОУ (арочник), **инв. №340/С-294759** | Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, 9 | Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель. Одноэтажное металлическое здание, 1999 года постройки. Общая площадь 139,6 м кв. | | |
| ***Земельный участок*** *на праве постоянного пользования площадью* ***4,6746 га*** *с кадастровым номером 324581600601000043.* ***Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные: в прибрежных полосах водных объектов, площадь 4,6746 га, в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,2918 га*** | | | | |
| Склад ГСМ, **инв. №340/С-295183** | Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, 7 | Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Одноэтажное кирпичное здание, 1970 года постройки. Общая площадь 36,5 м кв. | | |
